№ 11 (609) 18 сакавіка 2009 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Лукашэнку суправаджалі дзесяткі людзей, Адамкуса — адзін ахоўнік**

Старонка 8



**Міхалок быў непрыстойны нават на Каранацыі**

Старонка 11

**Меліта, праўнучка Стэфаніі**

Старонка 8

## У НУМАРЫ

**Еўропа спадзяецца вынасіць яшчэ адно дзіця**

Меркаваны візіт Еўракамісара Беніты Ферэра-Вальднэр у Мінск так і не адбыўся. Але прыпыненне санкцый падоўжылі яшчэ на дзевяць месяцаў. **Старонка 3.**

**Казулін засноўвае новы рух**

Былы кандыдат на пасаду прэзідэнта і палітвязень запрашае лідэраў інтэлігенцыі ў «Наш дом». **Старонка 3.**

**Гісторыя: на руінах Мінску**

У пасляваенным Мінску, у якім забаронена рабіць здымкі руінаў, бо гэта прэрагатыва толькі афіцыйных органаў, рэгулярна на эцюды выходзіць 14-гадовы хлопец. Яго занятак выглядае бязвінна: ён проста практыкуецца. Піша Алег Дзярновіч. **Старонка 12.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — **старонка 2**.

# Дайце толькі нам юаняў, хунвэйбіны ў нас свае

**Агульная сума замежных запазычванняў ад пачатку году сягнула астранамічнай лічбы $5,2 млрд. Да залежнасці ад Расіі дабавілася прывязка да Кітаю.**



Беларусь атрымае амаль $3 млрд ад Кітаю на аснове ўгоды «своп» на няясных умовах.

Угода «своп» — гэта своеасаблівы тып здзелак абмену, ад англійскага слова «swap», абмен баш на баш. Згодна з пагадненнем аб валютнай угодзе «своп», заключаным між Нацбанкам Беларусі і яго кітайскім адпаведнікам, Народным банкам Кітаю, Беларусь атрымае 20 мільярдаў юаняў (каля $3 млрд), а кітайскі бок — каля 8 трыльёнаў беларускіх рублёў.

Беларускі бок уключыць юані ў склад золатавалютных рэзерваў. Кітай жа будзе выкарыстоўваць рублі для разлікаў з Беларуссю.

Нагадаем, што асноўны артыкул беларускага экспарту ў Кітай — калійныя ўгнаенні.

У 2008 годзе доля Кітаю ў замежным гандлі Беларусі склала 2,8%. Беларусь экспартавала ў Кітай тавараў на суму $623,9 млн, імпартавала — на $1414,8 млн. Адмоўнае сальда склала $790,9 млн, а ў гэтым годзе яно, як прагназуецца, яшчэ вырасце.

З інфармацыі Нацбанку цяжка зразумець дэталі пагаднення, напрыклад, у якой форме Беларусь кампенсуе курсавую рызыку.

Фактычна, наша краіна бярэ трохгадовае пазычанне ў валюце, курс якой стабільны.

Такім чынам, агульная сума дзяржаўных запазычванняў ад пачатку году дасягнула астранамічнай лічбы $5,2 млрд. Акрамя таго, дасягнутыя дамоўленасці пра атрыманне яшчэ 0,5 млрд ад Расіі і 1,7 млрд ад МВФ. Беларусь цаною будучых гадоў забяспечыла сабе адну з найтаўшчэйшых антыкрызісных падушак у свеце.

Кітай быў сярод галоўных спажыўцоў беларускага калію, экспарт якога рэзка ўпаў у выніку фінансавага крызісу. Заключэнне пагаднення дазволіць аднавіць экспарт калійных угнаенняў. Эканомія дэфіцытнай валюты на імпарце будзе большая, чым змяншэнне надыходжанняў ад экспарту. Пакуль цяжка ацаніць, якую ўскосную цану заплаціць за тое Беларусь.

**Мікола Бугай**




### Пракаповіч прапаведуе пераход на расійскія рублі ва ўзаемаразліках

Кіраўнік Нацбанку Беларусі заявіў пра курс на адмову ад даляраў. Перамоўны працэс з Расійскай Федэрацыяй па выкарыстанні ва ўзаемаразліках у якасці рэзервовай валюты расійскага рубля блізкі да завяршэння, заявіў старшыня праўлення Нацыянальнага банку Пётр Пракаповіч 16 сакавіка. Паводле яго словаў, аналагічныя перамовы вядуцца і з Украінай. Такім чынам, паводле яго, Беларусь плануе ў разліках з усімі асноўнымі гандлёвымі партнёрамі перайсці на выкарыстанне рэгіянальных валютаў.

## Лукавыя лічбы

Другі месяц запар Белстат завышае паказчык тэмпаў росту ВУП, заніжаючы дэфлятар. У рэальнасці тэмпы падзення ВУП дасягнулі амаль 6%. Піша эканаміст **Аляксандр Чубрык. Старонка 4.**

# Як ідзе падрыхтоўка да Дня Волі?




Да 25 Сакавіка, Дня Волі, дня першага абвяшчэння незалежнасці Беларусі, — застаецца тыдзень. Незалежныя палітычныя партыі дружна называюць гэты дзень найважнейшым нацыянальным святам. У гэты дзень традыцыйна тысячы, а часам, як у 1996 ці 2006-м, дзесяткі тысяч людзей выходзяць на вуліцы сталіцы для ўдзелу ў традыцыйным святочным шэсці. Аднак нідзе ў Мінску няма афішак ці налепак, якія б запрашалі жыхароў гораду на свята, хоць арганізатары даўно заклікалі сабрацца а 18-й гадзіне каля Акадэміі навук і прайсціся шэсцем па галоўным праспекце. У чым прычына такой пасіўнасці палітыкаў? «НН» звярнулася да кіраўнікоў палітычных партый і арганізацый з пытаннем, што іхнія структуры зрабілі для інфармавання людзей пра Дзень Волі.

**Лявон Баршчэўскі, старшыня Партыі БНФ:** «Не спяшайцеся — будзе дазвол, будуць і ўлёткі. Чаму няма яшчэ? Усё вельмі проста: бо палітычныя сілы, у якіх ёсць грошы, вырашылі праігнараваць гэтую акцыю».

**Аляксандр Мілінкевіч, лідэр Руху за Свабоду:** «На гэты раз аргкамітэт быў створаны адной арганізацыяй — Партыяй БНФ. Нас не запрасілі да абмеркавання. Я лічу прыватызацыю Дня Волі непрымальнай. Вы абсалютна маеце рацыю, калі кажаце, што аргкамітэт гэта адна справа, а свята — зусім іншае. Таму я абавязкова выйду на вуліцу 25 Сакавіка. Разам з тым, я яшчэ дакладна не ведаю маршруту, не ведаю, што будзе ў выпадку адмовы. Калі нехта не хоча раіцца з намі, то гэта іхнія праблемы».

**Анатоль Ляўковіч, старшыня БСДП:** «Скажу шчыра, што БНФ нас на іхнюю акцыю не запрашаў. Нашы сябры будуць адзначаць свята ў рэгіёнах. Думаю, што недзе там улёткі ёсць. Чаму ў Мінску няма, вам трэба званіць генералу Фралову. Кажаце, што ён за космас ужо адказвае? Мы ведаем гэта, але ж ён па-ранейшаму кіраўнік гарадской арганізацыі».

**Уладзімір Навасяд, старшыня аргкамітэту Партыі свабоды і прагрэсу:** «Мы праводзім традыцыйную штогадовую акцыю ў Магілёве, на месцы пахавання Цішкі Гартнага. Там будзе збірацца наш актыў. У Магілёве друкаваная прадукцыя ёсць. Накіроўваем людзям паштоўкі з запрашэннем далучыцца да нас».

**Сяргей Калякін, старшыня ПКБ:** «Асобныя нашы сябры будуць удзельнічаць у святкаванні 25 Сакавіка, але партыя ў аргкамітэт не ўваходзіла. Гэта традыцыйна, што арганізацыяй займаецца БНФ. Асабіста мяне ў гэты дзень у Мінску не будзе».

**Павел Севярынец: сустаршыня аргкамітэту БХД:** «Наша віна, былі занятыя з'ездам і падачай дакументаў на рэгістрацыю БХД. Аднак на Дзень Волі прыйдзем».

**Віктар Гарбачоў, лідэр кампаніі «За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва»:** «Мінск — гэта асобная краіна. Мы адразу сказалі, што няхай сталіцай займаюцца тыя, хто там жыве. Наша ж прадукцыя распаўсюджваецца па рынках усёй краіны, ад Віцебску да Гомелю, ад Крупак да Рэчыцы».

**Наста Палажанка, намесніца старшыні зарэгістраванага ў Чэхіі «Маладога фронту»:** «Абурае, як праводзіцца падрыхтоўка да святкавання. Партыя БНФ прыватызавала гэты дзень. На прэс-канферэнцыю па падрыхтоўцы не былі запрошаныя сябры моладзевых арганізацый, якія робяць найбольшую мабілізацыйную працу».

**Юры Беленькі, намеснік старшыні КХП-БНФ:** «Спачатку няхай афіцыйны адказ дасць Мінгарвыканкам, а потым мы разгледзім пытанне, ці варта выраблляць друкаваную прадукцыю».

**Анатоль Лябедзька, лідэр АГП:** «Мы выпусцілі. Наклад, праўда, не той, які хацелася б. Таксама выйшла газета «Глоток воздуха», прысвечаная гэтай даце. Свой унёсак у інфармацыйнае асвятленне Дня Волі мы зрабілі».

**Апытаў Зміцер Панкавец**

**УЛАДЗІМІР НЯКЛЯЕЎ**

## Сцяг

Чуў, што паэт Уладзімір Някляеў прапанаваў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі ў якасці гімну ўласны верш «Сцяг». Надрукуйце, калі ласка, гэты верш.

**ВБ, Гомель**

Лунае, нескароны,
На векавых вятрах
Наш, ад крыві чырвоны,
Ад болю белы, сцяг.
Наш бел–чырвона–белы,
Нябесны, вольны, смелы,
Наш бел–чырвона–белы,
Наш сцяг.

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю — **6 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**С.Б.** з Астравецкага раёну.
**Аксане Л.** з Пінску.
**І.Д.** з Мядзельскага раёну.
**А.З., Івану Л.** з Пружанскага раёну.
**Сержуку Р.** з Бярозаўскага раёну.
**Івану З., А.Т., В.М., Тамары К., С.К., Марыне Я., Ірыне З., Аляксандру Ш., Ірыне З., А.П.** з Смалявіцкага раёну.
**Іне С., Уладзіміру Д., Галіне Г., А.Ж.** з Барысаўскага раёну.
**А.С., Фёдару Г., Наталлі П., Юр'ю К.** з Мазырскага раёну.
**І.Ф.** з Брэсцкага раёну.
**Аляксандру П.** з Жлобінскага раёну.
**Георгію С.** з Бешанковіцкага раёну.
**Д.П., С.К., М.С., С.Т.** з Лідскага раёну.

# Еўропа спадзяецца вынасіць яшчэ адно дзіця

**Меркаваны прыезд Еўракамісара Беніты Ферэра–Вальднэр у Мінск так і не адбыўся. Візіт быў адменены ў апошні момант — літаральна за паўдня да вылету ў Беларусь. Прычына — Лукашэнка раптоўна накіраваўся ў Арменію.**

Аналітыкі сыходзяцца ў думцы, што такім чынам ён стараўся спадабацца Маскве, занепакоенай адносінамі між афіцыйным Мінскам і Брусэлем, якія апошнім часам набылі большую інтэнсіўнасць. Сустрэча з прадстаўніцай Еўрасаюзу была запланаваная яшчэ некалькі тыдняў таму, а візіт у Ерэван быў узгоднены толькі ў панядзелак. Збоку гэта выглядала як ухіленне ад сустрэчы, што на дыпламатычнай мове азначае непавагу да партнёра. Аднак Еўропа пакуль праглынула новы выбрык Лукашэнкі амаль бязгучна.

«Патрэбна дадатковая прапрацоўка беларускага пытання», — растлумачыла адмену паездкі сама Б.Ферэра-Вальднэр. Чаму? Бо Еўропа «не можа гуляць каштоўнасцямі, якія ў Еўрасаюзе з'яўляюцца асноватворнымі». Невялікі жэст Еўракамісарка ўсё ж зрабіла: 12 сакавіка замест Лукашэнкі яна сустрэлася ў Страсбургу з Анатолем Лябедзькам і Аляксандрам Казуліным. Абодва палітыкі перакананыя, што рабіць Еўропе крокі насустрач беларускім уладам пакуль нясвоечасова.

Той жа Казулін у інтэрв'ю літоўскаму парталу Delfi выказаў спадзяванне, што Літва выступіць супраць саступак афіцыйнаму Мінску.

«Мы разумеем, што літоўцы не могуць здрадзіць Беларусі. Яны нашы браты, якія ў гэты гістарычны момант прымуць правільнае маральнае рашэнне, і не дазволяць сабе апусціцца да ўзроўню эканамічных інтарэсаў», — выказаў надзею А.Казулін.

Цікава, што ў нядзельнай аналітычнай передачы «Панарама тыдня» вядоўца Юры Пракопаў хваліў Мілінкевіча за пазіцыю, якую ён займае ў пытанні перамоваў Беларусі і ЕС. Затое ганіў Лябедзьку і Казуліна. З гэтага можна зрабіць выснову, што Лукашэнку карціць атрымаць запрашэнне на саміт у Прагу.

Дарэчы, рашэнне аб запрашэнні ці незапрашэнні ў чэшскую сталіцу беларускага лідэра ўсё яшчэ не прынятае. Паводле словаў нямецкага чыноўніка, з якім гаварыў карэспандэнт «НН», за час да пражскай сустрэчы 7 траўня ў Беларусі «могуць адбыцца негатыўныя з'явы». Найперш тут маецца на ўвазе прызнанне ці непрызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.

«Міністру замежных справаў Мартынаву было рэзка заяўлена, што ў выпадку прызнання аддзеленых ад Грузіі дзяржаваў далейшае супрацоўніцтва будзе вельмі праблематычным», — сказаў нямецкі чыноўнік.

Паводле яго, чэшскае старшынства ЕС было за тое, каб запрасіць Лукашэнку. Аднак той жа нямецкі бок разглядае найлепшым варыянтам запрашэнне ў Прагу міністра Мартынава. Лукашэнку запросяць толькі ў тым выпадку, калі сваю згоду дадуць усе 27 краін-сяброў ЕС.

Пакуль жа найбольш жорсткую пазіцыю ў дачыненні да Беларусі займаюць Вялікабрытанія і Галандыя, краіны традыцыйна блізкія да ЗША. Швецыя ж заклапочаная арыштам Мікалая Аўтуховіча. Да апошніх дзён у спісе краін, якія блакавалі рашэнне, была і Польшча. Аднак магчымасць адносна мірнага правядзення з'езду Саюзу палякаў у Гродне змякчыла пазіцыі Варшавы.

Што да ўдзелу Беларусі ў праграме «Усходняга партнёрства», то справа найхутчэй вырашыцца станоўча. Той самы нямецкі прадстаўнік заявіў, што ўдзел у гэтай праграме адкрывае перад краінамі выдатныя перспектывы сяброўства ў Еўрасаюзе. Кажучы іншымі словамі, удзел ва «Усходнім партнёрстве» прадугледжвае тую ж ступень дачыненняў з ЕС, якімі цешацца Нарвегія, Ліхтэнштэйн і Ісландыя. Яны маюць тыя ж правы, як і краіны-сябры Еўрасаюзу, апроч супрацоўніцтва ў аграрнай сферы і права голасу. «Але да самога ўступлення застаецца мінімальны крок».

Уплывовая International Herald Tribune задалася пытаннем, ці хоча ў Прагу сам Лукашэнка? Як прыклад яны прыводзяць раптоўны адлёт кіраўніка Беларусі на армянскі курорт Цахкадзор замест сустрэчы з Ферэра-Вальднэр, а таксама з'яўленне новых палітвязняў.

«Адносіны Еўропы з гэтай краінай разглядаюцца некаторымі назіральнікамі як галоўная праверка здольнасці Еўропы весці палітыку «мяккай сілы», а таксама яе здольнасці перавабліваць на свой бок саюзнікаў Масквы. Лукашэнка мог сутыкнуцца з праблемамі на ўнутрыпалітычным фронце, якія вымусілі яго часова прыпыніць свой дрэйф у кірунку Еўропы. Паводле меркавання аналітыкаў, збліжэнне Беларусі з Еўропай усё ў большай ступені становіцца раздражняльным фактарам для Масквы», — піша газета.

Тым часам 16 сакавіка міністры замежных справаў краін Еўрасаюзу ў Брусэлі разгледзелі пытанне візавых санкцый супраць беларускіх чыноўнікаў. Пасля дыскусіі было прынятае рашэнне працягнуць мараторый на візавыя санкцыі яшчэ на дзевяць месяцаў. Еўропа спадзяецца за гэты перыяд вынасіць яшчэ адно дзіця для заходняй супольнасці.

**Зміцер Панкавец**

# Казулін засноўвае новы рух

**Былы кандыдат на пасаду прэзідэнта і палітвязень запрашае лідэраў інтэлігенцыі ў «Наш дом».**

Пасля таго як Казуліна змясцілі з пасады старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, пачалі з'яўляцца чуткі пра магчымы ад'езд палітыка за мяжу. Гаварылася, што ён можа заняць нейкую пасаду ў ЕГУ. Тым не менш, тыя размовы так і засталіся на ўзроўні чутак.

Потым Казулін спрабаваў неяк сысціся з незарэгістраванай Беларускай партыяй працы, якая найбліжэйшым часам мае правесці ўстаноўчы сход. Новая назва — Беларуская партыя працоўных. Аднак і з гэтым варыянтам нешта не выгарала.

Цяпер палітык падышоў да рэалізацыі новай задумы. Старшыня ТБМ Алег Трусаў гаворыць, што меў размову з Аляксандрам Казуліным накont уступлення ў «Наш дом». «Мы паразмаўлялі, я сказаў, што для большай канкрэтыкі патрэбен статут арганізацыі, пачытаць яе мэты і задачы. Гэта ж не робіцца з наскоку», — кажа А.Трусаў.

Паводле нашых звестках, падобныя размовы Аляксандр Казулін меў з кіраўніцтвам Саюзаў пісьменнікаў і мастакоў, Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына». Апошняя арганізацыя, у прыватнасці, адмовілася ад удзелу ў новым праекце.

Сам Аляксандр Казулін адмаўляецца каментаваць звесткі пра стварэнне новай арганізацыі. «Вядзецца арганізацыйная праца, яшчэ няма пра што гаварыць», — кажа былы палітвязень.

Тым часам на сайце радыё «Свабода» старшыня Віцебскай абласной арганізацыі АГП Вольга Карач была падпісаная як заснавальнік рэспубліканскай грамадзянскай кампаніі «Наш дом». Старыя актывісты пад новую шыльду?

**ЗП**



**Аляксандр Казулін (другі злева) паміж часовым паверанымЗША Джонатанам Мурам і Міхаілам Марынічам.**

## СЦІСЛА

### Нарад Франаку — за сцягі

Франака Вячорку пакаралі пазачарговым нарадам пасля выступу хлопца на дыскусіі пра сцягі — дзяржаўны і бел-чырвона-белы. Апроч таго, яму занеслі вымову ў асабістую справу за невыкананне загаду. Падставай стала абнаўленне прыватнага дзённіка ў інтэрнэце. Камандаванне раней загадвала Франаку заўсёды паказваць свае запісы для публікацыі.

### Уладлену Функ ізалявалі яшчэ на тыдзень

Сакратарка амерыканскага адваката Эмануіла Зэльцэра Уладлена Функ 12 сакавіка адбыла гадавы тэрмін пакарання і павінна была выйсці на волю.

Але замест гэтага яе з калоніі перавезлі ў гомельскі ізалятар часовага ўтрымання. Цяпер жанчыну рыхтуюць да дэпартацыі з Беларусі.

### Сідорскаму — 55

Прэм'ер-міністр Беларусі аднагодак Лукашэнкі. Нарадзіўся 13 сакавіка 1954 г. у Гомелі.

### Уладальнік МТЗ-РІПА ідзе ў прэзідэнты Літвы

Пра ўдзел у выбарах прэзідэнта Літвы заявіў прэзідэнт інвестыцыйнай групы Ukio bankas, мільянер Уладзімір Раманаў. У чацвер ён падаў дакументы ў Галоўвыбаркам Літвы. Уладзімір Раманаў кіруе холдынгам, у які ўваходзяць літоўскі «Каўнас», шатландскі «Хартс» і наш МТЗ-РІПА, і мае бізнэс-сувязі з лукашэнкаўцамі.

### Ці будзе супольная дэлегацыя ўладаў і апазіцыі?

У Парыжы ў аўторак прайшло паседжанне Паліткамітэту Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы. Разглядалася і пытанне, ці вяртаць Беларусі статус спецыяльна запрошанага ў Асамблею. Умова — згода уладаў і апазіцыі мець у Асамблеі супольную дэлегацыю.

**ЗП; інф. радыё «Свабода», БелаПАН**




Старшыня Белстату Уладзімір Зіноўскі (злева) і намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур.

# Лукавыя лічбы

**Другі месяц запар Белстат завышае паказчык тэмпаў росту ВУП, заніжаючы дэфлятар. У рэальнасці тэмпы падзення ВУП дасягнулі амаль 6%. Піша эканаміст Аляксандр Чубрык.**

Быў такі савецкі эканаміст Ханін, які распрацоўваў альтэрнатыўныя ацэнкі аб'ёмаў гаспадаркі Савецкага Саюзу, а пасля і Расіі. Ягоныя артыкулы ды кнігі публікаваліся нават за савецкім часам, нават у часопісе «Коммунист», хоць высновы, якія ён рабіў, сведчылі аб вялізнай ступені фальсіфікацыі статыстычнага тэмпаў эканамічнага росту ў СССР. Адзін з ягоных артыкулаў называўся «Лукавая лічба». Працы Ханіна ўзгадаліся, калі была апублікаваная лютаўская статыстыка аб стане беларускай эканомікі.

Паводле яе:

1) у студзені—лютым рэальны ВУП вырас на 2,3% у параўнанні з адпаведным перыядам 2008 году.

2) гэта менш, чым у студзені (4,2% у параўнанні з студзенем мінулага году).

3) дэфлятар ВУП у студзені—лютым склаў 10,4%.

4) гэта менш, чым у студзені — 19,6%.

Тутака хочацца сказаць вялікі дзякуй Белстату, што падалі сапраўдную лічбу дэфлятару за студзень. З яе шляхам элементарнага арыфметычнага выліку вынікае, што ВУП у студзені ўпаў на 4,1%, а не вырас на 4,2% («НН» №8 амаль не памылілася, калі ацэньвала падзенне на 5%).

Затое лічба дэфлятару за студзень—люты, роўная 10,4%, — з разраду неймавернага. У 2008 годзе дэфлятар складаў 20,6%, у студзені — 19,6%. Дэфлятар ніякім чынам не мог так рэзка знізіцца ў пераліку за студзень—люты ў параўнанні са студзенем. Кан'юнктура рынкаў у студзені і лютым мала розніласа. У рэальнасці дэфлятар за студзень—люты мала розніўся ад студзеньскага.

Дарэчы тут будзе патлумачыць, што азначае эканамічны тэрмін «дэфлятар» і нашто ён выкарыстоўваецца. Гэта індэкс сярэдняга росту цэнаў у кошыку, які ўключае ў сябе не толькі спажывецкія, крамныя цэны, але і цэны прамысловых вытворцаў, цэны будаўнічых паслуг і г.д. Аб'ём эканомікі вылічваецца ў бягучых цэнах (у студзені—лютым ён склаў 18 307 млрд рублёў), але кожны чалавек разумее, што 1 рубель у студзені 2009 каштаваў меней, чым у студзені 2008, што за яго меней можна было купіць, ён быў умоўным эквівалентам меншае вартасці. Таму рост ВУП заўжды разлічваецца не ў бягучых, а ў супастаўных цэнах, з пералікам праз дэфлятар.

Калі дэфлятар за студзень—люты быў роўны прыкладна тым самым 19,6%, атрымліваем скарачэнне ВУП за гэтыя два месяцы амаль на 6% у параўнанні з студзенем—лютым 2008 году. Г.зн. у лютым ВУП змяншаўся хутчэйшымі тэмпамі, чым у студзені.

# Беларуская фінансавая сістэма падышла да мяжы

«Галоўнай небяспекай для эканомікі Беларусі цяпер з'яўляецца дэфіцыт плацёжнага балансу, які па выніках 2008 г. склаў $4,4 млрд. Між тым сума павялічваецца штоквартальна», піша доктар эканамічных навук, загадчык кафедрай фінансаў і банкаўскай справы ВШКБ БДЭУ Уладзімір Усоскі ў «Эканамічнай газеце».

Ён адзначае: «Ячшэ задоўга да крызісу чыстыя замежныя актывы банкаў зменшыліся з $221 млн (1.01.2000 г.) да мінус $2,23 млрд (1.07.2008 г.).

Палітыка дзяржавы па стымуляванні эканамічнага росту «падштурхоўвала» банкі да росту валютных запазычанасцяў у нерэзідэнтаў.

У выніку «ў верасні 2008 г. пачаўся крызіс ліквіднасці беларускіх банкаў», — піша эксперт.

«Значны рост замежных запазычанасцяў прывёў да адчувальнага росту валавога замежнага доўгу, — распавядае Уладзімір Усоскі. — Сукупны замежны доўг РБ на 1.11.2008 г. дасягнуў $14,557 млрд. Для параўнання адзначым, што гэты паказчык на 1.01.2006 г. быў $5,128 млрд, на 1.01.2007 г. — $6,786 млрд, 1.01.2008 г. — $12,494 млрд. Гэткае імклівае нарошчванне даўгоў моцна паўплывала на «разаграванне» эканомікі».

Доктар эканамічны навук заяўляе, што далейшая дэвальвацыя беларускага рубля можа стаць вырашальным фактарам падрыву ліквіднасці банкаў.

«Таму неабходнасць выраўноўвання плацёжнага балансу — сёння ледзь не самая актуальная задача», — заяўляе эксперт.

**МБ**

# 3:10

**Постсавецкія краіны безнадзейна адстаюць па заробках ад цэнтральнаеўрапейскіх дэмакратый.**

Сярэдні заробак **у Беларусі** ў студзені складаў каля 334$. Што ў суседзяў?

Сярод суседніх краінаў па ўзроўню заробкаў Беларусь займае перадапошняе месца.

Ніжэйшыя заробкі толькі **ва Украіне**, па якой сусветны крызіс ударыў найбольш балюча. Нашыя паўднёвыя суседзі атрымліваюць усяго толькі **$216** штомесяц.

Беларускія 920 тысяч рублёў (334 даляры) ў студзені гэтага году — неадназначныя лічбы. Паводле інфармацыі Міністэрства статыстыкі, заробак у рублях вышэйшы за леташні, ён падняўся на 5%. А вось у далярах праз дэвальвацыю рубля заробак пакаціўся ўніз.

**Расія** мае сярэднестатыстычныя **459$**. Праўда, калі ўлічваць, што заробкі ў Маскве і сыравінных рэгіёнах удвая большыя, чым ва ўсёй астатняй краіне, атрымліваецца, што расійская глыбінка жыве толькі трохі лепей за Беларусь.

Нашыя ж заходнія суседзі даўно ўжо беларусаў абскакалі. Гаманцы такіх падобных да нас **літоўцаў** змяшчаюць штомесяц **946**. У 2,83 разы больш за нашыя! З такімі паказальнікамі Літва яшчэ і прайграе Латвіі і Польшчы, якія знаходзяцца па іншы бок тысячадаляравага паказальніка. **Палякі** атрымліваюць у сярэднім **1045$**, а **латвійцы** — каля **900$**. Сярэдні заробак у Латвіі ў канцы 2008-га быў пераваліў за тысячу даляраў, аднак гэтая краіна моцна пацярпела ад фінансавага крызісу. Раней найбольшы заробак быў у палякаў, у 2008-м ён дасягаў 1250 даляраў, але дэвальвацыя злотага зняцэніла яго амаль на 20%.

**Ягор Марціновіч**

# За нерухомасцю таннеюць аўтамабілі

**Пачалі зніжацца цэны на патрыманыя машыны.**

Збываюцца прагнозы экспертаў: следам за цэнамі на нерухомасць і новыя аўто папаўзлі ўніз і цэны патрыманых машынаў. Недаступнасць крэдытаў і зніжэнне заробкаў збілі попыт. Прадаўцы даражыліся-даражыліся, але вымушаныя скідаць цану.

Да дна, аднак, яшчэ далёка. Да зімы наступнага году цана патрыманых машынаў можа знізіцца нават на 30—40%.

**МБ**

## СЦІСЛА

### Як Заблоцкія на мыле

У студзені доля стратных прамысловых прадпрыемстваў у Беларусі складала 30,4% ад іх агульнага ліку. Рэнтабельнасць прамысловасці за студзень склала 8,1%. Вышэйшай, чым у сярэднім, рэнтабельнасць была ў нафтаздабыўнай (43,2%), медыцынскай (22,1%), нафтаперапрацоўчай прамысловасці (13,5%). Ніжэйшай, чым у сярэднім, — у аўтамабільнай (3,6%), хімічнай (1,8%), тэкстыльнай прамысловасці (0,7%). Стратнай была мікрабіялогія (мінус 1,1%), цэлюлозна-папяровая (мінус 3,2%), мясная і малочная прамысловасць (мінус 4,1%).

### Экспарт трактароў знізіўся на 60%

Беларусь у студзені 2009 году знізіла экспарт трактароў на 59,5% у параўнанні з адпаведным месяцам мінулага году, або да 2067 штук, паведамляе Белстат. Пры гэтым вытворчасць трактароў у студзені ўпала на 48,6% да 3069 адзінак.

### Эканаміст Залескі: Яма скончыцца толькі пад 2012 год

Калі суаднесіць кошт золата з ваганнямі індэксу Доў-Джонса, то ідзе чацвертая за сто гадоў яма, якая мусіць скончыцца недзе да сярэдзіны 2012 году.

### З'явіўся беларускі Allegro

Самы папулярны ва Усходняй Еўропе інтэрнэт-аўкцыён асвоіў і БелНэт. Палякі ды чэхі ўжо колькі гадоў менавіта праз яго набываюць разнастайныя рэчы. Асабліва зручна выкарыстоўваць яго для продажу і куплі патрыманых рэчаў і рарытэтаў, кошт якіх найлепш вызначаецца аўкцыённа. Наведаць беларускі Алегра можна на allegro.by.

### Планаў грамаддзе

Іранцаў хочуць адхіліць ад пабудовы ГЭС на Нёмане. З адпаведнай ініцыятывай да кіраўніка дзяржавы звярнулася «Белэнэрга». Іранскай кампаніі Marvestan Group, якая ў 2007 годзе выйграла тэндэр на пастаўку абсталявання для Гродзенскай ГЭС, закідаюць невыкананне кантрактных абавязкаў. Паводле планаў, станцыю павінны былі здаць у эксплуатацыю ўжо ў 2010 годзе, а на Нёмане яшчэ і конь не валяўся.

**СП; РР; МБ; БелаПАН, радыё «Свабода»**

# Як у хакеі

**А ці быў хлопчык? Кажу не пра хлопчыка Міколку, які на мінулым тыдні прыляцеў быў на самалёце разам з татам у Ерэван. Пад «хлопчыкам» маю на ўвазе дыялог, які, нібыта, апошнія некалькі месяцаў вядзецца паміж афіцыйным Мінскам і кіраўніцтвам Еўрасаюзу. Піша Віталь Тарас.**

Як напісаў некалі журналіст Аляксандр Геніс пра свайго ката: не тое, каб гаспадар і кот зусім не камунікавалі паміж сабой, але ж і размовай гэта не назавеш.

Сярод часткі журналістаў укараніўся стэрэатып, згодна з якім дзеянні Аляксандра Лукашэнкі заўсёды непрадказальныя. Але ў тым, што тычыцца, прынамсі, замежнай палітыкі, гэты стэрэатып не дзейнічае. Ва ўсялякім выпадку, кажучы словамі класіка, у гэтым вар'яцтве ёсць свая сістэма.

Узяць хоць бы апошнюю сітуацыю з «пераносам» візіту камісаркі ЕС Беніты Ферэра-Вальднэр у Мінск. Варта нагадаць, як 12 гадоў таму тагачасная старшыня Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы Лені Фішэр падчас свайго візіту ў Беларусь не змагла сустрэцца з Лукашэнкам. Запланаваная сустрэча не адбылася ад таго, што ў кіраўніка дзяржавы раптоўна ўзнікла жаданне пагуляць у футбол.

Можна было б паразважаць у тым сэнсе, што ў чалавека, маўляў, было цяжкое дзяцінства і склаліся няпростыя адносіны з прадстаўніцамі процілеглага полу — напрыклад, з жанчынамі, імёны якіх пачыналіся на літару Ф. (Вось ах, за з еўрапейскім палітыкам мужчынскага полу на літару С усё атрымалася добра. І літара Ц раздражнення афіцыйнага Мінску, па ўсім відаць, не выклікае.)

Але больш лагічным будзе дапусціць, што ў аснове двух падобных інцыдэнтаў ляжыць адна і тая ж схема (ці праграмка, ці вірус, які пачынае дзейнічаць у зададзеных параметрах). Як толькі гульня ў дыялог з Захадам з мэтай націснуць на Маскву заходзіць надта далёка і Масква пачынае ўсур'ёз пагражаць Мінску не даваць больш грошай, наступае «нечаканае» ахаладжэнне ў дачыненнях з заходнімі дыпламатамі.

**Як толькі Масква агрызаецца, Мінск «нечакана» ахаладжае адносіны з Захадам.**

Прыкладна пра гэта гаварыў у нядзельнай праграме «Аб'ектыў» на «Белсаце» Зянон Пазняк. Яго выказванні пра «чацвярныя стандарты» Еўропы што да Беларусі і пра адсутнасць у краіне сапраўднай апазіцыі маглі падацца некаму брутальнымі. Але па сутнасці запярэчыць палітыку было цяжка. Аляксандр Лагвінец, памочнік Аляксандра Мілінкевіча, таксама запрошаны для ўдзелу ў перадачы, фактычна і не спрачаўся з апанентам у ацэнцы цяперашняга «дыялогу». Ён удакладніў толькі, што абвешчаныя ўладамі Беларусі лібералізацыя і дыялог пашыраюць інфармацыйнае акенца, што дае магчымасць апазіцыі даносіць сваю думку да большай колькасці людзей.

Але ж ад пачатку «лібералізацыі» прайшло ўжо некалькі месяцаў, а вынікаў пашырэння «акенца» нешта пакуль не відаць.

Зянон Пазняк, між іншага, вядомы як аўтар даволі дакладных палітычных прагнозаў. Гэтым разам ён прадказаў, што месяцы праз два ў Беларусі могуць пачацца народныя хваляванні. Але адказваць на пытанне, калі можа адбыцца яго вяртанне на радзіму, катэгарычна адмовіўся.

Невядома, колькі яшчэ працягнецца згаданы «дыялог» з Захадам. Магчыма, працяг мараторыю ЕС на санкцыі супраць чыноўнікаў РБ дасць, так бы мовіць, дадатковы час для гульні.

У хакеі ёсць паняцце sudden-death (імгненная смерць) — калі пры нічыйным выніку ў авертайме нехта забівае шайбу, гульня на гэтым сканчаецца. Любая недарэчнасць ці грубае парушэнне правілаў можа прывесці да імгненнай развязкі. Іншая справа, што пераможцаў не будзе. А згуляць матч нанова наўрад ці ўдасца.

**Інфармацыйны англійскі часопіс «Эканаміст» пра Лукашэнку і стаўленне да яго еўрапейскіх лідэраў:**

**Можа быць, неабходна ў нейкі момант са спадаром Лукашэнкам сустрэцца — пажадана ў рамках угоды па ягоным сыходзе ад улады. Аднак было б занадта ставіцца да яго так, нібыта ён ужо ўсе патрабаванні выканаў.**

# Ніякага ультыматуму Варшавы не было

**Польшча не мае намеру ўвязваць пытанні вакол сваёй нацыянальнай меншасці з агульнымі пытаннямі збліжэння Беларусі з ЕС. Піша Барыс Тумар.**

Польскае Міністэрства замежных справаў абвергла інфармацыю тыднёвіка «Упрост», што ў сувязі са з'ездам Саюзу палякаў Беларусі польскі МЗС перадаў беларускаму боку свайго роду ультыматум.

Такая інфармацыя не паходзіла з крыніцаў у МЗС, падкрэсліваецца ў заяве.

Тэма «ўдзелу Беларусі ва «Усходнім партнёрстве», а таксама «сітуацыя вакол СПБ» застаюцца тэмай двухбаковага дыпламатычнага дыялогу, падкрэсліваецца ў заяве, але абодва бакі «імкнуцца вырашаць гэтыя пытанні ў духу кампрамісу і ўзаемнага паразумення».

Польскія ўлады сапраўды, як выглядае, хацелі б нармалізацыі становішча вакол СПБ-Барыс. Гэта значыць, у ідэале, легалізацыі яе дзейнасці шляхам афіцыйнага прызнання. А на гэтым этапе — прынамсі, беспрашкоднага правядзення з'езду (чаго яны і дабіліся).

Аднак Варшава не мае намеру ўвязваць пытанні вакол сваёй нацыянальнай меншасці з агульнымі пытаннямі збліжэння Беларусі з ЕС, аднозначна далі зразумець у польскім МЗС.

З заявы польскага МЗС вынікае, што ўкід інфармацыі пра нібыта «ультыматум» выгадны сілам, якія б хацелі сарваць беларуска-еўрапейскі дыялог.

# Напіўся і пакаціўся

Найлепшы спартовец мінулага году, цяжкаатлет з Барысава, Андрэй Арамнаў дыскваліфікаваны на два гады ўмоўна і пазбаўлены прэзідэнцкай стыпендыі.

Такое рашэнне 20 сакавіка прыняў прэзідыум Федэрацыі цяжкай атлетыкі. Справа ў тым, што 20-гадовага алімпійскага чэмпіёна двойчы цягам апошніх трох месяцаў затрымлівалі супрацоўнікі барысаўскага ДАІ за рулём у нецвярозым стане. Паводле новага закону, у такім узросце яму б нават не прадалі алкаголю.

Як адзначыў намеснік міністра спорту Дзмітры Шычко, спачатку планавалася вынесці Арамнаву вельмі суровае пакаранне, аж да адлічэння са штату нацыянальнай каманды. Потым, узважыўшы ўсе плюсы і мінусы, прынялі больш лаяльнае рашэнне.

Цяпер праводзіцца следства па правапарушэннях, здзейсненых Арамнавым. Да адказнасці спартовец будзе прыцягнуты, запэўніваюць міліцыянты. Увогуле ж, паўторнае затрыманне за рулём у п'яным выглядзе можа цягнуць за сабой нават турэмнае зняволенне. Аднак наўрад да гэтага дойдзе.

Сам Арамнаў адмаўляецца гутарыць пра гэтыя інцыдэнты, аднак у інтэрв'ю газеце «Прессбол» расказаў, што пасля трыумфу на Алімпіядзе ў яго з'явілася вельмі шмат зайздроснікаў. «Мне цяпер грэх скардзіцца на жыццё, усё ідзе сваім парадкам... Вось толькі правы нядаўна адабралі. Можа, яшчэ з арміі звольняць. Думаю, іх у мяне забралі, бо я некаму надакучыў. Нічога не хачу гаварыць на гэтую тэму. Зрэшты, можа, гэта знак нейкі, што за руль мне лепш не садзіцца. Можа, пешшу будзе хадзіць лепш», — сказаў А.Арамнаў.

У жніўні ў Пекіне Андрэй Арамнаў бліскуча выйграў Алімпійскія гульні, усталяваўшы тры сусветныя рэкорды за адзін вечар. Потым быў прызнаны найлепшым спартоўцам году ў Беларусі. Не вынес хлопец славы.

**Зміцер Панкавец**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Таму што ў нас шмат дрэваў і травы

**Па канале «Лад» на Дзень канстытуцыі паказваюць праграму пра асновы беларускай незалежнасці і дзяржаўнасці.**

Словы пра шматвяковую беларускую гісторыю і традыцыі пераплеценыя з кадрамі са школьнага ўроку, дзе дзецям тлумачаць сутнасць сцяга і герба. Кажуць, што сімвалы з'явіліся даўно, калі нашы продкі адбіваліся ад ворагаў, якія перашкаджалі шчасліва працаваць.

У гэты час ў кадры паказваюць малюнак вершнікаў на канях, на дзідах якіх прымацаваны сцяжкі з зубром... Пасля дзіцячая рука малюе каравыя сімвалы РБ.

Пасля словаў пра векавыя традыцыі распавядаюць, што па ўваходжанні Беларусі ў СССР у 1922 годзе паўстала патрэба стварэння дзяржаўных сімвалаў. Не дужа ж пільна было ім, калі толькі ў 1927 годзе герб нарэшце распрацавалі. І чамусьці амаль не розніўся ён ад РСФСРаўскага. Бальшавіцкія пачаткі нашага сцяга таксама яскрава паказаныя — узнагароджанне зялёнай стужкай у 1950-я.

Пра Пагоню і бел-чырвона-белы сцяг не згадалі ані слоўцам. «Пасля кароткага перыяду нестабільнасці грамадзяне рэспублікі на рэферэндуме...»

У тым кіно настаўніца спытала ў дзяцей, чаму мы маем такі сцяг. Шасцігодкі патлумачылі тым, што ў нас шмат дрэваў і травы. Што думаюць яны пра чырвоны колер, не паказалі, а ў кадры з'явіўся афіцэр, які пачаў распавядаць пра граніцу нашай краіны...

**Іван Кавяра, Баранавічы**

# Анжаліка Борыс пераабраная старшынёй Саюзу палякаў

15 сакавіка ў Гродне прайшоў VII з'езд непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў у Беларусі. У працы з'езду бралі ўдзел 165 дэлегатаў. Некаторыя з удзельнікаў не змаглі дабрацца да Гродна. Гэта першы з'езд СПБ пасля расколу ў арганізацыі, які адбыўся ў 2005 годзе.

Многія меркавалі, што ўлады і на гэты раз шляхам правакацый і затрыманняў сарвуць працу. Аж не, прайшло ўсё ціха. Актывіст Саюзу палякаў, журналіст Андрэй Пачобут нават не пусціў у памяшканне дзяржаўных журналістаў, бо тыя не падавалі дакументаў на акрэдытацыю.

Лідэрам аб'яднання зноў была абраная Анжаліка Борыс. Адразу па абранні яе павіншаваў прэм'ерміністр Польшчы Дональд Туск. А напярэдадні з'езду з Борыс і Пачобутам сустракаўся польскі прэзідэнт Лех Качыньскі.

З'езд накіраваў зварот да Аляксандра Лукашэнкі з прапановай наладзіць дыялог паміж аб'яднаннем і дзяржаўнымі структурамі, каб паспрыяць афіцыйнай рэгістрацыі СПБ.

З'езд афіцыйнага Саюзу палякаў на чале з Юзафам Лучнікам павінен адбыцца сёлета ў верасні.

**Зміцер Панкавец**



**Народу з'ехалася столькі, што ў маленькай майстэрні ўсе не змясціліся. Многія стаялі на двары, слухаючы жывую трансляцыю.**



**Палякі цэняць свайго лідэра — Анжаліку Борыс.**

# Дзень салідарнасці




110 чалавек выйшлі 16 сакавіка на акцыі салідарнасці з палітвязнямі і зніклымі палітыкамі, якія адбываюцца 16-га дня кожнага месяца. Людзі стаялі з партрэтамі ваўкавыскіх прадпрымальнікаў, Арцёма Дубскага, Таццяны Ціўкевіч, Віктара Ганчара, Анатоля Кроўскага. Таксама ўпершыню былі заўважаныя выявы рэкрутаў — Вячоркі, Шылы і Хведарука. Лідэры моладзі Артур Фінькевіч і Яўген Афнагель зрабілі кароткія прамовы. Яны заклікалі людзей прыйсці 25 Сакавіка а 18.00 да Акадэміі навук, каб разам адзначыць Дзень Волі. Міліцыя нікога не затрымлівала.

**ЗП**

## Бел-чырвона-белы сцяг над Адміністрацыяй прэзідэнта

Раніцай 16 сакавіка на даху дома №30 па праспекце Незалежнасці ў Мінску быў вывешаны бел-чырвона-белы сцяг. Нацыянальны сцяг лунаў літаральна за сотню метраў ад адміністрацыі Лукашэнкі да дзевяці гадзін раніцы, паведамляе сайт BulletinOnline.org

У СВЕЦЕ

# Ва Украіне перамаглі радыкальныя нацыяналісты

**Аб'яднанне «Свабода» нечакана набрала большасць галасоў на мясцовых выбарах.**

Неспадзяваным вынікам закончыліся выбары ў абласную раду Тарнопальскай вобласці на Заходняй Украіне. З 34% галасоў на іх перамаглі радыкальныя нацыяналісты з аб'яднання «Свабода». Другое месца занялі прыхільнікі прэзідэнта Ючшанкі з партыі «Адзіны цэнтр» з 14%, трэцяе — Партыя рэгіёнаў Януковіча з 10%. Правалам скончыліся выбары для цяперашняй прэм'еркі Юліі Цімашэнкі, партыя якой сабрала толькі 8% галасоў.


**Алег Цягнібок — новы лідэр украінскай правіцы.**

«Свабоду» ўзначальвае былы дэпутат Вярхоўнай Рады Алег Цягнібок, які ў 2004 годзе заслужыў сабе спрэчную рэпутацыю заявай на адрас «маскалёў» і «жыдоў». Тады многія расцанілі ягоныя паводзіны як правакацыю, аплачаную з Масквы.

На мінулых выбарах у парламент ён сабраў толькі 0,7%, а ў Кіеўраду — менш за 3%. Цяпер ён абчасаўся, але ўсё адно займае пазіцыі на крайне правым флангу. У час крызісу ўкраінцы, расчараваныя паводзінамі традыцыйных партый, звязаных з буйным капіталам, звярнулі свае погляды да тых, у кім бачаць абаронцаў перадусім нацыянальных інтарэсаў.

**МБ**

## Рэвалюцыя на Мадагаскары

Пасля некалькіх ультыматумаў жаўнеры занялі афіцыйную рэзідэнцыю прэзідэнта краіны Марка Раваламананы. Раней на бок апазіцыі перайшлі паліцыя і міністр юстыцыі. Новым лідэрам стаў 34-гадовы мэр сталіцы краіны Андры Радзуэліна.

**МБ**

# Прыватным расійскім інвестарам больш не да Беларусі

Але дзяржаўныя структуры Расіі будуць працягваць спробы пранікнення ў стратэгічныя галіны беларускай эканомікі. Піша **Алесь Чайчыц** (Масква).

Прыцягненне замежнага капіталу было адной з асноўных мэтаў эканамічнай лібералізацыі, летась абвешчанай уладамі Беларусі. Між тым, відаць, крызіс у глабальнай эканоміцы робіць гэту мэту практычна недасягальнай — і праз значна меншую прывабнасць беларускіх актываў, і праз рэзка меншыя магчымасці саміх інвестараў. Перш за ўсё гэта тычыцца інвестараў з Расіі, з аб'ектыўных прычынаў найбольш блізкіх да беларускай эканомікі.

Структурныя праблемы беларускай эканомікі робяць для расійскіх інвестараў непрывабным укладанне грошай у Беларусь, і гэта закранула абодва апошнія буйныя праекты, дзе амаль атрымалася прыцягнуць расійскіх прыватных інвестараў у Беларусь: продаж МАЗу і пабудову «Мінск-city».

Машынабудаўніцтва, адна з асноўных галін эканомікі Беларусі, дзе вялася размова пра прыцягненне стратэгічных інвестараў, агулам церпіць ад сусветнага эканамічнага крызісу мацней за іншыя сектары эканомікі. Адпаведным чынам упаў попыт на прадукцыю беларускага машынабудавання, у прыватнасці, Мінскага аўтамабільнага заводу, на ўдзел у прыватызацыі якога ў мінулым разлічваў падкантрольны Алегу Дзерыпаску холдынг «Базовый элемент». Падзенне плацёжаздольнага попыту і сумнеўныя перспектывы падвышэння дзелавой актыўнасці ў Беларусі здольныя зрабіць малапрывабнымі і інвестыцыі ў беларускую нерухомасць на дадзеным этапе. У лютым з'явіліся паведамленні аб праблемах у будаўніцтве дзелавога цэнтру «Мінск-city», што фінансуецца расійскай нафта-газавай кампаніяй «Итера». Калі «Итера» не здолее фінансаваць будаўніцтва, беларускім уладам будзе амаль немагчыма знайсці іншага інвестара для мінскіх хмарачосаў.

З іншага боку, самі расійскія інвестары адчуваюць цяпер істотны недахоп фінансавання. У прыватнасці, на слыху праблемы з крэдыторамі ў таго ж «Базового элемента», які змагаецца за рэструктурызацыю пазыкаў перад унутранымі і замежнымі крэдыторамі. «Русские машины», даччыная структура холдынгу, на няпэўны тэрмін замарозіла перамовы па ўдзеле ў прыватызацыі МАЗу, пацвердзіла крыніца ў кампаніі. Невядома, ці ўвогуле з'явіцца пытанне пра ўдзел «Базового элемента» ў прыватызацыі МАЗу на парадку дня ў будучыні — усё будзе залежаць ад сітуацыі на рынку, якую цяпер спрагназаваць немагчыма.

Дэвэлаперскія кампаніі ў Расіі аднымі з першых трапілі пад удар крызісу яшчэ ўвосені 2008 году, праз недасяжнасць крэдытных рэсурсаў і немагчымасць рэфінансавання сённяшняй запазычанасці.

«Итера девелопмент» на стан на сярэдзіну 2008 году мела вялікую ўласную запазычанасць і таму завязаная на падтрымцы мацярынскай структуры, для якой, зважаючы на няпрофільны характар дэвэлаперскага бізнэсу, значна большы прыярытэт можа мець, напрыклад, будаўніцтва газаправоду ў Туркменістане, чым нерухомасці ў Беларусі.

Між тым, прадстаўнікі «Итеры девелопмент» адмаўляюць наяўнасць істотных праблемаў з рэалізацыяй беларускага праекту і аптымістычна ацэньваюць перпектывы праекту і беларускага рынку нерухомасці ўвогуле, з улікам таго, што заканчэнне пабудовы «Мінск-city» плануецца на 2020 год.

Нарэшце, для расійскіх кампаній, здольных у дадзеных варунках рабіць буйныя паглынанні, з'яўляецца сэнс шукаць прывабныя мэты інвеставання не ў Беларусі. У першую чаргу, актывы патаннелі ў самой Расіі, і для тых, хто мае свабодныя грошы (як, напрыклад, «Онексим»), яны шмат прыцягальнейшыя, чым патэнцыйныя актывы ў Беларусі. Шматлікія закрэдытаваныя прадпрыемствы сярэдняга памеру ці не ва ўсіх сектарах эканомікі знаходзяцца за крок ад банкруцтва, і шукаць мэты для паглынання сярод іх значна прывабней, чым спрабаваць удачу ў іншай дзяржаве. Прынамсі, у Расіі значна прадказальнейшыя і, галоўнае, больш знаёмыя гэтым інвестарам правілы гульні, а таксама лепшая пазіцыя тых самых прамыслова-фінансавых групаў у стасунках з дзяржаўнай уладаю.

У сваю чаргу, сама расійская дзяржава будзе ўсяляк спрыяць укладанню расійскіх грошай у нацыянальную эканоміку і ратаванню яе стратэгічных галінаў ад пераходу ў рукі замежных інвестараў. А гэта робіць відавочным спад будучай замежнай інвестыцыйнай актыўнасці расійскіх кампаній, пагатоў у дачыненні да такой рызыкаванай эканомікі, як Беларусь.

Такім чынам, напрошваецца выснова пра тое, што агулам расійскім інвестарам цяпер яўна не да беларускіх актываў.

Аднак можна зрабіць выключэнне для пэўнай катэгорыі расійскіх кампаній, у якіх засталіся грошы і якія пакуль не адмовіліся ад інвестыцый у Беларусь. Размова ідзе пра дзяржаўныя банкі, якія з'яўляюцца галоўнымі эканамічнымі інструментамі ў руках расійскай дзяржавы, на якія шмат у чым ускладзена задача на вывад расійскай эканомікі з крызісу.

Так, ёсць сведчанні пра імаверны продаж пакету да 20% акцый Белаграпрамбанку (БАПБ) расійскаму Россельхозбанку — дзяржаўнаму банку развіцця малое і сярэдняе сельскагаспадарчае вытворчасці. Таксама з'явілася інфармацыя аб імавернай куплі Сбербанкам, найбольшым банкам у Расіі, беларускага БПС-банку: «Ведомости» са спасылкаю на «Інтэрфакс» паведамілі, што Сбербанк можа ініцыяваць ацэнку кошту беларускага банку ўжо ў сакавіку.

## З дзесяці буйных банкаў Беларусі чатыры ўжо кантралююцца расійскімі дзяржаўнымі банкамі.

БАПБ і БПС — адныя з найбуйных банкаў у краіне, з уласным капіталам адпаведна Br 2,24 трлн і Br 384 млрд (паводле infobank.by). Варта дадаць, што на дадзены момант з дзесяці найбуйнейшых банкаў паводле памеру ўласнага капіталу чатыры (Белзнешэканомбанк, Белгазпромбанк, Банк ВТБ (Беларусь) і Банк Мінск—Масква) ужо кантралююцца расійскімі дзяржаўнымі банкамі.

Расійскія аналітыкі не разлічваюць, што гэтыя пакупкі, калі яны адбудуцца, прыцягнуць за сабою істотныя інвестыцыі ў развіццё набытых банкаў. Беларусь — патэнцыйна досыць прывабны рынак, але ў дадзеных умовах рызыкі эканамічнай і палітычнай небяспекі робяць вялікія ўкладанні ў краіну наўрад ці мэтазгоднымі. Пакупкі могуць рабіцца дзеля зацвярджэння сваёй прысутнасці на рынку ў доўгатэрміновай перспектыве.

У гэтых умовах увага звяртаецца і на патэнцыйную неэканамічную матывацыю гэтых пакупак. Расійская ўлада, відавочна, зацікаўленая ва ўсталяванні свайго палітычнага ўплыву на Беларусь праз рэальную эканамічную прысутнасць — больш трывалую і доўгатэрміновую, чым любыя палітычныя пагадненні. Варта памятаць, што Беларусь працягвае атрымліваць ад Расіі шматмільённыя крэдыты: днямі чакаецца паступленне апошняга 500-мільённага траншу ў рамках крэдыту на USD 2 млрд паводле лістападаўскага беларуска-расійскага пагаднення, акрамя гэтага вядуцца перамовы пра дадатковы расійскі крэдыт Беларусі памерам RUR 100 млн. Гэтыя доўгатэрміновыя крэдыты будуць, імаверна, вымагаць не толькі палітычнай лаяльнасці, але і эканамічных прэферэнцый. Такім чынам, крэдыты яўна будуць важкім аргументам у руках Расіі на перамовах аб продажы беларускіх банкаў.

Пятнаццацігадовае спазненне Беларусі з правядзеннем рынкавых рэформаў трагічным чынам наклалася на сусветны эканамічны крызіс, які не дазволіць хуткімі тэмпамі пераадолець адставанне ад іншых краінаў усходняй Еўропы, на што спадзяваліся ў Беларусі. Крызіс робіць усю сітуацыю значна меней прадказальнаю, адзінамомантаваю.

Праз пагаршэнне эканамічнай сітуацыі перад беларускімі ўладамі паўстае пытанне пра ўсё большае трапляннe краіны ў запазычанасць перад крэдыторамі як на Усходзе, так і на Захадзе. Справядлівай падаецца нядаўняя думка маскоўскага палітолага беларускага паходжання Кірылы Коктыша: у найбліжэйшыя гады ЕС і Расія будуць падтрымліваць Беларусь ад дэстабілізацыі, каб забяспечыць транзіт нафты і газу. Але залежнасць ад падтрымкі будзе вымагаць ад Мінску палітычных і эканамічных саступак. ЕС у гэтым можа патрабаваць далейшых дэмакратычных зменаў, а Расія — кантролю над эканамічнымі актывамі.

У любым разе, пытанне пра прыцягненне стратэгічных інвестараў у прадпрыемствы кшталту «Белазу», МАЗу, МТЗ і «Белшыны» будзе ўставаць усё больш востра: у доўгатэрміновай перспектыве беларуская дзяржава не мае рэсурсаў для падтрымання канкурэнтаздольнасці іх прадукцыі, а ў кароткатэрміновай мае досыць абмежаваны набор інструментаў для падтрымання іх жыццяздольнасці ў час крызісу. Рана ці позна паўстане пытанне аб продажы гэтых актываў па вельмі нізкіх цэнах, і ў найгоршым выпадку сітуацыя можа дайсці і да продажу іх за сімвалічную цану.

**Алесь Чайчыц**

**маскоўскі фінансавы журналіст, спецыялізуецца на зліццях і паглынаннях.**




# Новы ARCHE

Выйшаў падвойны нумар (1,2—2009) часопісу ARCHE. У ім:

**з палітычнае аналітыкі** — Віталь Сіліцкі піша пра трансфармацыю лукашэнкаўскага рэжыму ў апошнія паўгоду. Рашэд Чоўдхуры піша, хто ці, дакладней, што стаіць за перамогай Барака Абамы.

**з гісторыі** — грунтоўная праца Яна Запрудніка «Палітычнае змаганне за Беларусь у царскіх Дзяржаўных Думах (1906–1917)». Архівіст Васіль Матох піша пра ўсталяванне татальнай цэнзуры і ідэалагічнага кантролю ў БССР у 1920-я.

**з атракцыяў** — фотарэпартаж з першага з'езду Партыі БНФ у 1989 годзе.

**з літаратуры** — пераклад апавядання Немiровіча-Данчанкі «Стары Замак. З казак сапраўднасці».

**ЛК**

падпісны індэкс 00345

# Лукашэнку суправаджалі дзесяткі людзей, Адамкуса — адзін ахоўнік

**«НН» пацікавілася ў прэс-службы Адамкуса, колькі асобаў суправаджалі яго на адпачынку.**

Колькі асобаў суправаджае Аляксандра Лукашэнку ў ягоных паездках на адпачынак, дакладна невядома, бо незалежных журналістаў да яго не падпускаюць. Ад начальніка аэрапорту Ніш стала вядома, што ў тыднёвую паездку на сербскі курорт Капаонік кіраўнік Беларусі і ягоная світа прыляцелі двума самалётамі: прэзідэнцкім «Боінгам» плюс яшчэ «Эмбраерам». Сербскія газеты на вока ацэньвалі колькасць суправаджэння ў 40—150 чалавек. Прэс-служба Лукашэнкі і ён сам пасля назвалі гэтыя лічбы (ці то апошнюю з іх) завышанымі, але дакладнай лічбы не прывялі.

Адначасова з Лукашэнкам свой водпуск адгуляў прэзідэнт Літвы Валдас Адамкус. «НН» запыталася ў прэс-службы прэзідэнта Літвы, з колькіх асобаў складаецца яго світа ў часе адпачынку? Аказалася, Валдас Адамкус адпачывае раз на год у Мексіцы ў кампаніі ўсяго двух чалавек — сваёй жонкі і аднаго ахоўніка. Ён не праводзіць афіцыйных сустрэч і выдзяляе ўвесь час выключна на адпачынак.



**Валдас Адамкус з жонкай Алмай.**




**Адразу з Сербіі Аляксандр Лукашэнка скіраваўся на армянскі курорт Цахкадзор. Дзе правеў кароткія перамовы з прэзідэнтам краіны Сержам Саргсянам. На сустрэчы быў і малы Коля.**

Варта адзначыць, што паездка Лукашэнкі ў Сербію вызначалася як «працоўная», мэтамі яе намінальна былі сустрэчы з бізнэсоўцамі Сербіі. Таму, маўляў, і суправаджэнне было апраўданым. Праўда, эканамічныя сувязі Беларусі з Сербіяй былі і ёсць мізэрнымі, таму рэзон тыднёвага перабывання там вялізнае дэлегацыі цяжка зразумець.

**Стася Мініч, Вільня;**
**Мікола Бугай, Мінск**

# Крызіс зачапіў нават прапаганду

**Белтэлерадыёкампанія збіраецца перавесці з кантрактаў на дамовы аж 400 супрацоўнікаў.**

«На працоўным сходзе нам паведамілі, што 400 чалавек унесеныя ў спіс тых, хто будзе пераведзены з кантрактаў на дамовы», — расказаў нам карэспандэнт тэлеканалу «Лад».

У аддзеле кадраў Белтэлерадыёкампаніі, куды мы звярнуліся, паведамілі, што чакаецца змяншэнне аб'ёмаў вяшчання і што вакантных месцаў для журналістаў цяпер няма. У прэс-службе дадалі: «Калі з эфіру знікне нейкая перадача, гэта не значыць, што журналістаў звольняць. Іх перапрафілююць на іншыя праекты».

Наконт масавага звальнення творчых супрацоўнікаў у прэс-службе заявілі, што «паняцця «скарачэнне штату» ў нас няма. Ёсць людзі, якім працягваюць працоўны кантракт. Ёсць тыя, каму ў гэтым адмаўляюць».

**Адар'я Гуштын**




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Штанге паставіў на месца міністра спорту

На справаздачнай канферэнцыі Беларускай федэрацыі футболу 14 сакавіка галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Бернд Штанге растлумачыў міністру спорту і турызму Аляксандру Грыгараву, чаму беларускі футбол не завяёўвае медалёў.

«Людзі патрабуюць адказу: калі ж будзе вынік, калі будуць медалі чэмпіянату Еўропы, калі мы здолеем выйсці на чэмпіянат свету?» — сказаў міністр.

«Лепш за ўсё да поспеху падняцца на ліфце, адразу на дзесяты паверх. Але мы ідзем па лесвіцы, і гэта крышку даўжэй, спадар міністр», — сказаў Б.Штанге, якому ў дзень канферэнцыі споўніўся 61 год.

Паводле меркавання трэнера, у новым сезоне беларускі футбол павінен перасягнуць вынікі, паказаныя ў 2008 годзе. «Недастаткова гуляць унічыю з Турцыяй, Аргенцінай, Германіяй, «Зенітам», «Ювентусам». Мы павінны перамагаць. », — заявіў Б.Штанге.

Задачу выхаду ў фінальную частку чэмпіянату свету-2010 ён назваў цяжкай.

«У найбліжэйшых двух матчах з Казахстанам і Андорай мы павінны браць шэсць ачкоў, каб атрымаць добрую зыходную пазіцыю для гульняў з Харватыяй, Англіяй і Украінай», — зазначыў трэнер.

Ключом да поспеху беларускага футболу ён лічыць павышэнне кваліфікацыі мясцовых спецыялістаў. «Штогод нашы трэнеры выязджаюць на міжнародныя стажыроўкі. УЕФА і ФІФА дапамагаюць атрымліваць нам новыя веды. Гэтыя веды мы павінны данесці да кожнага гораду, да кожнага трэнера першай, другой лігаў, дзіцячых трэнераў. Мы хочам гуляць у сучасны, прывабны футбол», — заявіў Б.Штанге.

**Дзмітры Уласаў, БелаПАН**

# Меліта, праўнучка Стэфаніі



**Меліта Станюта — праўнучка знакамітай Стэфаніі Станюты — заваявала тры бронзавыя медалі на другім этапе Гран-пры па мастацкай гімнастыцы.**

У чэскім Брне беларуска ўзышла на п'едэстал у практыкаваннях з мячом, стужкай і скакалкай, саступіўшы ва ўсіх трох дысцыплінах моцным расіянкам Яўгеніі Канаевай і Веры Сесінай.

Два тыдні таму на першым этапе ў Маскве 15-гадовая беларуска таксама заваявала тры медалі: адно срэбра (з мячом) і дзве бронзы (скакалка і стужка).

Этап Гран-пры ў Маскве быў дэбютным для Меліты, і тры ўзнагароды — гэта вялікі яе асабісты поспех.

Меліта Станюта таксама перамагала на чэмпіянатах краіны, заваявала тры срэбраныя медалі на чэмпіянаце Еўропы ў Турыне.

Дарэчы, у інтэрв'ю «Спортивной панораме» пасля Гран-пры ў Маскве Меліта сказала, што сваімі выступамі ўвасабляе мару сваёй бабулі Стэфаніі Станюты, якая лічыла мастацкую гімнастыку спалавам спорту і акторскага майстэрства і ў «70 гадоў магла сесці на шпагат».Сярод мараў Меліты Станюты — трапіць у складзе беларускай зборнай на чэмпіянат свету па мастацкай гімнастыцы, што пройдзе ў верасні.

**АГ**


Так можа выглядаць Купалаўскі пасля разбудовы.

# Цікава-цікава...

Прапанова студэнтаў і выкладчыкаў БНТУ па праектаванні прыбудовы да будынку Купалаўскага тэатру ўхвалена як перспектыўная. Начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрствы культуры Ігар Чарняўскі лічыць, што прыбудова дазволіць вырашыць шматлікія праблемы тэатру. Праект маюць дапрацоўваць, каб не ўзнікала дысгармоніі з ансамблем.

**МБ**

# Мона Ліза... служыць у гродзенскім МНС

**З пачатку гэтага году на фасадзе гродзенскага Музею пажарнай справы з’явілася пано, якое адлюстроўвае гісторыю пажарнай службы старажытнага гораду. Твар маладой супрацоўніцы МНС у правым куце выявы да болю нагадвае...твар знакамітай Моны Лізы аўтарства Леанарда да Вінчы. Мяркуйце самі.**

**СП**


S13.RU




БЕЛАПАН

**15 сакавіка ў Гомелі прайшоў конкурс «Міс Беларусь» сярод глухіх дзяўчат. За перамогу змагаліся сем прыгажунь з Гомельскай вобласці, Мінска, Оршы (Віцебская вобласць), Бабруйску (Магілёўская вобласць). Удзельніцы выконвалі песні на мове жэстаў, танцавалі, дэфілiравалі ў эстрадных касцюмах і купальніках. Перамагла ў конкурсе мінчанка Ілона Ярмолік, якая прадставіць Беларусь на конкурсе «Міс Еўропа» сярод глухіх у ліпені гэтага году ў Празе.**
**І.Ярмолік вучыцца ў Мінскім прафесійна-тэхнічным каледжы электронікі.**

# Я табе дам рагатых

Мінчанін ударыў сваю сужыхарку штангай за няўдалы тост.

Інцыдэнт адбыўся ў Маскоўскім раёне Мінску. Гаспадыня кватэры распівала алкаголь з сужыхаром і знаёмай. У чарговы раз напаўняючы шклянкі, госця гучна прамовіла тост: «За вас, рагатых!». Застолле скончылася. Гаспадыня кватэры лягла спаць. Пасярод ночы яе разбудзіў шум. Як паведамляе «Вечерний Минск», побач стаяў сужыхар з грыфам ад штангі ў руках. Са словамі «Зараз я пакажу табе рагатых!» мужчына замахнуўся. Удар прыйшоўся на правую нагу. Пацярпелую шпіталізавалі з дыягназам «закрыты пералом». Мужчына змешчаны ў ізалятар. Ён можа атрымаць да васьмі гадоў зняволення.

**ДГ**

# «Дакладна-не-Абрамовіч» вывеў клуб роднай вёскі ў лідэры Бундэслігі

Сапраўднае яго імя Дытмар Гоп. Ён камп’ютарны мільярдэр, але ягонае імя грыміць у Германіі з іншай прычыны: спадар Гоп паламаў статус–кво айчыннага футбольнага свету.

### Who is Who

Дытмар Гоп сваім прозвішчам адпавядае жыццёваму наробку. 69-гадовы працаголік вырас у вёсцы Гофэнхайм, што паміж Гайдэльбергам і Гайльбронам.

Гуляў у лініі нападу мясцовага аматарскага футбольнага клубу, у гульні, паводле сведчанняў ад-налетак, ішоў на поўную рызыку і выкладваўся да канца. Тое ўсталяваў сабе за правіла і па-за стадыёнам.

Вырашыў атрымаць адукацыю. Прадаваў цукровыя буракі, збіраў слімакоў для рэстаранаў і за гэта плаціў за вучобу ва ўніверсітэце.

Вывучыўся інфарматыцы і ў 32 гады заснаваў фірму SAP (Business Software Solutions Applications and Service — Праграмнае забяспечанне, перыферыя і сэрвіс для бізнэсу). На сёння ў фірме 50 тысячаў супрацоўнікаў. Гоп!

Калі прыйшоў да дабрабыту, пачаў спансаваць спорт. Дваццаць гадоў таму ўзяўся за нерэальную, на першы погляд, ідэю: вывесці футбольны клуб роднай вёскі ў Бундэслігу. Гляньце цяпер на турнірную табліцу: ці ёсць там Гофэнхайм? Ёсць! І дзе? А наверсе табліцы! І яшчэ раз Гоп.

Восеньскі малы чэмпіянат 2008 году клуб наогул завяршыў на першым месцы!


**Дытмар Гоп з сваёй «вясковай» камандай STG Гофэнхайм святкуе перамогу.**

### Сказаў «гоп» — а як пераскочыў?

Тэхнічна Дытмар Гоп зрабіў гэта так. Ён перанёс прынцыпы пабудовы свайго бізнэсу на гэту новую дзялянку.

Памяняў аматарскія структуры спартовага клубу на прафесійныя, запрасіў найлепшых трэнераў. Паўсюль у акрузе заснаваныя былі падлеткавыя фарм-клубы, прычым так, што ў школе клубу перспектыўныя маладыя футбалісты могуць атрымаць таксама і базавую гімназічную альбо прафесійную адукацыю — хто да чаго прыдатны.

У 2008 годзе Нямецкі футбольны звяз надаў Гофэнхайму годнасць элітнай школы футболу. Галоўны адмысловец паспеху трэнер Ральф Рангнік ў гэтым сама годзе заявіў, што не будзе заключаць кантракт з гульцамі, старэйшымі за 25 гадоў.

За Дытмарам Гопам замацавалася азначэнне «Дакладна-не-Абрамовіч». Тым не менш, Гоп уклаў у клуб і яго інфраструктуру больш за 100 мільёнаў еўра.

У 2010 годзе ён плануе здаць у эксплуатацыю стадыён для свайго вясковага клубу каля аўтабану А6 (дзеля лепшага даезду) на 30 тысячаў наведнікаў. І нават тут спадар Гоп застаецца бізнэсоўцам, бо пралічыў, што стадыён будзе ўтрымліваць сябе сам — будзе самаакупным.

У гэтым свеце ўсё магчыма. Трэба толькі моцна дабівацца.

**Яўген Бяласін, Брэст**



# Анархісты: АМОН — вораг народу, а адбіткі пальцаў — во вам

Крайнія левыя правялі шэраг акцый 15 сакавіка, у Міжнародны дзень барацьбы з паліцыйнай сваволяй. Яны вывесілі ў Мінску расцяжку «АМОН — вораг народу», а таксама шлёпалі на муры вось такія жартаўлівыя стэнсілы.

## БРСМ зладзіў у Магілёве акцыю «Размаўляй па-беларуску!»




У фае галоўнага корпусу універсітэту актывісты БРСМ ладзілі віктарыны на веданне беларускай мовы і раздавалі пераможцам падарункі. Студэнты маглі выйграць дыскі, значкі «Я размаўляю па-беларуску!» альбо фенечкі з нацыянальным узорам.

Ініцыятарам акцыі выступіла суполка БРСМ на гістфаку і яе сакратар **Павал Алекса (на фота)**.

«Натуральна, што аніводны з іх не пачне размаўляць сам у жыцці, — дзеліцца сваімі ўражаннямі на форуме інтэрнэт-сайту «НН» відавочца нязвыклае акцыі, — але ствараецца спрыяльны падмурак цярпімасці да носьбітаў мовы». «Прыемна было!» — кажа другі студэнт.

**МБ**




**Вясна. Рабчык харчуецца альховымі почкамі, Міншчына.**

## Як выжыць прадпрымальніку?

**Пішу вам ад імя маіх калег, індывідуальных прадпрымальнікаў (далей — ІП). Гандлюю побытавай тэхнікай. Сям'я, двое непаўналетніх дзетак.**

Да 2009 году яшчэ неяк можна было зарабіць, каб забяспечыць сям'ю. Але з студзеня 2009 году павялічылі адзіны падатак з 112 еўра да 150 еўра. А гэта каля 540 000 руб.

У лютым нашы кіраўнікі прыдумалі яшчэ адно катаванне для ІП. Увялі абмежаванні па выручцы. То бок, я плачу фіксаваны падатак 150 еўра = 540 000 руб. Памножылі гэтую лічбу на 20 і атрымалі суму = 10 800 000 руб. Мая выручка (сума прададзенага тавару) не павінна перавышаць гэтай лічбы. А сума, якая перавышае 10 800 000 руб, абкладаецца яшчэ 10% падаткам.

Атрымліваецца, што калі я маю пры продажы, у сярэднім, 15% ад аптовай цаны (хаця цяпер пакупніцкая здольнасць у людзей упала, і ў лютым-сакавіку продажаў фактычна няма), то няцяжка падлічыць мой даход ад фіксаванай сумы 10 800 000 руб. Ён складзе прыблізна 1 600 000 на месяц. Але з гэтай сумы трэба вылічыць выдаткі на:

1. Адзіны падатак = 540 000!!! руб.,
2. Арэнду гандлёвага памяшкання = 130 еўра = 470 000 руб.,
3. Транспартныя выдаткі, ТА транспарту, што складае ў месяц прыблізна 400 000 руб.,
4. Кватэрную плату, электраэнэргію, ваду, тэлефонныя размовы = 300 000 руб.,
5. Падатак сацыяльнай абароны = 75 000 руб.,
6. Выдаткі на рэкламу (мінімум) = 200 000 руб.,
7. Харчаванне, вопратка і іншыя выдаткі (мінімум для маёй сям'і ў месяц) = 1 000 000 руб.,
8. Дзіцячы садок, школа (абед, кнігі) 160 000 руб.,

Агулам выдаткі ў месяц, у сярэднім 2 145 000 руб.!!!

Тут мне могуць запярэчыць: прадавай болей. Але за што я магу прадаць вышэй суму 10 800 000 руб., мой прыбытак з'есць уведзены падатак 10%. Значыць, праца — дарма.

У майго калегі па бядзе (так можна смела назваць) сітуацыя яшчэ горшая. У яго шматдзетная сям'я. Плаціць ільготны падатак 120 еўра (меней на 20%) Значыць, максімальная сума выручкі ў яго складае 8 640 000 руб. Выдаткі на ўтрыманне сям'і практычна такія, як і ў мяне — каля двух мільёнаў. Жонка часова не працуе...

Як выжыць у такой сітуацыі? Усё даражэе: кватэрная плата, прадукты. Высокая арэнда памяшкання. Высокія падаткі. Дарагая рэклама ў газетах. Паліва таксама лічу дарагім для нашых грамадзян.

Хтосьці можа сказаць — ідзі на завод. Але каму я цяпер там патрэбны, тым больш з дыпломам аб вышэйшай адукацыі? Сваіх падзець няма куды, ды і заробкаў цяпер практычна на заводах няма.

У які лядовы палац, тэатр, цырк я магу звадзіць дзяцей (не кажучы пра сябе), калі думаеш: як пракармiцца?

**Аляксандр Дабравольскі, Мінск**

## Злучыць два Гомелі

**Нядаўна на беразе Сожу з'явіўся помнік Першаму гамельчуку: у чоўне стаіць чалавек, а побач — рысь, адвечны вораг чалавека.** Можа, скульптар хацеў высечы сабачую пысу, ды малаток саскочыў? Не. З-пад маскі алегорыі тырчаць вушы ідэалогіі. Не той ідэалогіі, чый ідал выглядае, нібы салавей-разбойнік, з-за перарослых елак на плошчы Леніна, а куды больш жывучай.

Рысь стала сімвалам Гомелю ў 1856 г., калі два батальёны карнікаў душылі ў гомельскім маёнтку сялянскія хваляванні. Іншародны для беларускай геральдыкі герб, з рыссю ды двухгаловым арлом, і яго прымітыўны цяперашні варыянт — гэта каланіяльны сурагат гістарычнага герба, які горад атрымаў ад Жыгімонта Аўгуста. Герба — з відарысам крыжа — за які, ужо ў суверэннай Беларусі, міліцыянты аддубасілі юнакоў проста ў цэнтральным парку.

Люстра гістарычных ведаў гамельчукоў — мясцовыя газеты. У адной з іх рэдагавалі матэрыял пра стары Гомель ды набралі буйным шрыфтам, нібы сенсацыю, некарэктную фармулёўку гісторыка: «Гомель стал городом только в 1852 году». І гэта — пра Гомель, які меў магдэбургскае права, герб, пячатку, і толькі праз амбіцыі гаспадара-каланізатара, што не хацеў цярпець побач павятовую адміністрацыю, быў абвешчаны мястэчкам. Адмежаванне ад дарасійскага Гомелю — вось што сімвалізуе рысь у чоўне Першага гамельчука.

Ад таго Гомелю не засталося нават руін. Але... Калінікалі, у час грабарскіх работ, людзі трапляюць у рэшткі сутарэнняў. І хаця гэта ўсяго толькі шнары апошняй вайны, гамельчукі дагэтуль верацу ў паданне пра лёхі, якія нібыта існуюць пад горадам. Калі пад пандусам палацу знайшлі замураванае схованка для рыдлёвак і грабель, трэ было бачыць, як дзятва тоўпілася ля адтуліны ў муры. Хочацца верыць, што калі дзеці павырастаюць, яны знойдуць лёхі, якія злучаць два Гомелі.

**Сяргей Баранаў, Гомель**

## Хачу праз газету падзякаваць

**тым хлопцам і дзяўчатам, якія выходзяць на Плошчу з партрэтамі зніклых і палітвязняў.** Калі б не вы, то і зніклых, і вязняў было б болей. Калі б не вы, можа, і мой унук быў бы ўжо ў турме, бо і ён чалавек вальнадумны, горды, не змаўчыць і несправядлівасці не трывае. Каб не вы, дык усіх нас здушылі б мацней, як калісьці саветы, якія за вязку сена гатовыя былі чалавека біць.

Бачыў вас з акна аўтобуса і ганаруся вамі. Сам я не змог бы так стаяць. Маю псіхалагічны бар'ер. На шэсці хаджу, а вось так стаяць перад усімі не здолею. Рады, што ёсць у нас смелая моладзь.

**Міхал В., Мінск**

## Разважанні на руінах мосарскага міфу

**«Наша Ніва» апублікавала артыкул «Доўгая дарога агента «Бімбы», прысвечаны мосарскаму пробашчу кс. Ёзасу Бульку («НН» № 7'2009), які, як піша газета, у маладосці мог быць суперагентам МГБ і, паводле літоўскіх следчых, мае дачыненне да забойства не менш як пяцідзесяці чалавек.**

Цягам паўтара дзесятка гадоў у Беларусі фармаваўся міф пра Мосар як пра такі райскі закутак, дзе ўсё прыгожа, усё па-хрысціянску, ніхто не п'е гарэлкі, а за гэтым усім стаіць надта ахвярны і пабожны ксёндз. Адпаведна, і глыбачане надта ганарыліся Мосарам.

Людзі, з якімі я там сустракаўся, расказвалі рознае. У Мосары ёсць кветкі, але няма духоўнасці, кажуць некаторыя людзі. Самі парафіяне называюць Мосар «духоўнай пустыняй».

Мяне ўразіла не мінулае кс. Булькі, і нават не ягоныя сённяшнія дзеі ў парафіі. Найбольш мяне ўразіла рэакцыя чытачоў на публікацыі. Вэрхал каментатараў на сайце «НН». Многія лічаць, што праўду трэ было хаваць. Што патрэбна было патураць існаванню несапраўдных стэрэатыпаў.

Шмат каму балюча ад таго, што міфы, у якія верыў, руйнуюцца, і людзі, якія былі аўтарытэтамі, аказваюцца зусім не такімі «белымі і пушыстымі», як здавалася. Шмат хто хацеў бы і надалей бачыць кс. Бульку ахвярным святаром і змагаром за духоўнае адраджэнне. Але рэчаіснасць іншая.

І не трэба жахацца, калі руйнуюцца старыя міфы. Гэта толькі чарговы раз паказвае, што не трэба рабіць куміраў ані з людзей, ані з іх справаў.

Бо толькі ў Валадарстве Божым усё будзе ідэальна.

**Кастусь Шыталь, Докшыцы**

## Місевіч пробашчам у Бягомлі

**15 сакавіка ў Глыбоцкім касцёле адбылася развітальная імша, на якой глыбачане развіталіся з ксяндзом Віктарам Місевічам.** Дэкрэтам біскупа Віцебскай дыяцэзіі Віктар Місевіч прызначаны пробашчам у Бягомль. Айца Віктара цёпла любілі на Глыбоччыне мы ўсе, асабліва моладзь.

**Зміцер Падлесны, Глыбокае**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**



Сяргей Міхалок яўна не ведаў, куды падзець усе гэтыя кароны.

# Міхалок быў непрыстойны нават на Каранацыіі

Хопіць. Трэба ўжо прызнацца, у нас не самая лепшая краіна. Як у іншых дзяржавах трэцяга свету, у нас буяе дзіцячае «Еўрабачанне», але досыць неразвіты дуэт «Гук і Чэк» (у прастамоўі — шоу-бізнэс). У дадатак годзе хлусіць, што Мінск — сталіца. Піша **Павал Касцюкевіч**.

Тыя, хто прыехаў на «Рок-каранацыю» ў маладзечанскі Дом культуры, маглі бачыць, дзе ў рытме року грукае сэрца Беларусі. Спрытны беларускі бамонд як міленькі сеў на электрычку «Мінск—Маладзечна». Вы веры не дасьцё: тут ёсць вялікі сімфанічны аркестр імя Міхала Клеафаса Агінскага (гучыць, гучыць як!), а таксама блюз-бэнд. А пасля псіхадэлічнага сольнага выступу на «Рок-каранацыі» кампазітара Андрэя Іванова, наўзбоч якога стаяла бандура, якая замяняла ўвесь гурт «Зарціпо», стала зразумелым, што вялікі адронны калайдэр краіны таксама месціцца тут. Ну і, вядома, сталіца ў Маладзечне, бо менавіта тут, у паўнюткай зале на 900 месцаў, быў каранаваны новы рок-кароль.

Як заўсёды адстароненая «Тройца», узброеная неспасцігальным жалем, а таксама ўсімі сваімі жалейкамі і жалеечкамі, атрымала прыз «Традыцыі і сучаснасць». Віталік Артыст з «Без білета» атрымаў кароны за «Выканаўцу году» і «Кліп году», пацвердзіўшы рэнаме, узрушыўшы залу рэфрэнам «У-у, Афрыка!». «Нейрадзюбелі» панкавалі і «гузікавалі». Пра жыццё, што як дзіўны сон, цягнулі яшчэ першыя рок-каралі «Крама». Прызнавалася вясне ў каханні падзецідзіцячы непасрэдная Ганна Хітрык, новаспечаная рок-князёўна.

І тут з'явіўся ён. Ва ўніформе шпанюка, накачаны і такі малады. Наш кароль. Небалюча ўкусіў за нагу вядучую, слоўна падкусіў прэсу, прымераў рок-карону паміж ног. З першымі яго крокамі па сцэне зала ўспомніла, што яна не абыдзе, а на рок-канцэрце і жвава паднялася. А ён чытаў вершы, пабудаваныя на супрацьпастаўленні тытанаў і пацукоў. Хацелася набіць сабе ягоную татуяванку і пайсці ў трэнажорную залу. Гэта хлопчыкам. Дзяўчатам, што пусціліся ў імпэтныя скокі, хацелася ўс(яго) і цалкам. Нават блюз-бэнд, які забыліся на сцэне, ківаў у такт рокенрольным песням саксафонамі і трамбонамі. Пеліся «Маніфест», «Зорачкі», а таксама ўсебеларускія (і, як пакрысе высвятляецца, усерасійскія) баевікі, больш вядомыя пад назвамі «У правай руцэ «Снікерс», у левай руцэ «Марс» і «у.е. — б'ютыфал смайл». Хай жыве новы кароль!

**Пераможцы ў намінацыях**

**Адкрыццё году** — гурт **Esprit**

**Традыцыі і сучаснасць** — гурт **«Тройца»**

**Рок-князёўна — Ганна Хітрык** («ДзеціДзяцей»)

**Выканаўца году — Віталь Артыст** («Без білета»)

**Кліп году — «Мечтатели»** («Без білета»)

**Песня году — «Зорачкі»** («Ляпіс Трубяцкой»)

**Альбом году — «Маніфест»** («Ляпіс Трубяцкой»)

**Рок-карона (гурт году) — «Ляпіс Трубяцкой»**

Дыпломам **«За вялікі ўнёсак у развіццё беларускага рок-н-ролу»** адзначаны **Андрэй Іваноў** (гурт «Зарціпо»).

**Адмысловыя ўзнагароды** атрымалі: **«Авангардшкола»** — ад «Нашай Нівы», **IQ48** — ад Generation.bY, **Esprit** — ад univer.by, **«Крама»** — ад пісьменніка і выдаўца Уладзіміра Сіўчыкава, **«Сад»** — ад «Еўрапейскага радыё», **«Князь Чарадзей»** — ад Global CD.

## ГАЛАСЫ

**Пятнаццаты рок-кароль Сяргей Міхалок:** «Дзякуй усім дактарам, якія вярнулі людзям весялосць».

**Дзяўчаты, якія прарваліся ў грымёрку і сфатаграфаваліся з Міхалком:** «Цяпер тут з намі ўсе фатаграфавацца будуць!»

**Чалавек у цывільным, спрабуючы прайсці за кулісы:** «Пусціце, я хоць з краёчку стану, пагляджу. Я міліцыянер. Вось пасведчанне». Не пусцілі.



Між выступамі рокераў даваў джазу сімфанічны аркестр.


Ганна Хітрык, рок-князёўна, акторка Купалаўскага тэатру — і проста прыгажуня.

# На руінах Мінску

**У пасляваенным Мінску, у якім забаронена рабіць здымкі руінаў, бо гэта прэрагатыва толькі афіцыйных органаў, рэгулярна на эцюды выходзіць чатырнаццацігадовы хлопец. Ягоны занятак выглядае бязвінна: ён проста практыкуецца. Насамрэч гэтыя замалёўкі былі рэалізацыяй плану па фіксацыі культурнай спадчыны Мінску, лёс якой заставаўся няпэўным. Піша Алег Дзярновіч.**

Свайго неафіцыйнага вучня на падобныя эцюды скіраваў слынны мінскі мастак-педагог Сяргей Каткоў, які заснаваў знакамітую потым студыю пры Палацы піянераў. Вучань жа быў неафіцыйны, бо юнак насамрэч хадзіў у музычную школу, але Каткоў заўважыў ягоную цікавасць да выяўленчага мастацтва і адметнасць стылю — фатаграфічны малюнак.

### «Ідзі малюй!»

Каткоў накіроўвае вучня ў розныя куткі гораду, ён цэніць, як мастак-пачатковец фіксуе архітэктурныя аб'екты: тое, што ўзносіцца сярод куродыму панявечанага гораду. Пра імпазантны дом ля галоўнага будынку Міністэрства ўнутраных справаў ён так і сказаў: «Ідзі малюй, гэтага дома можа хутка не быць!»

Той вучань — Анатоль Наліваеў. Свае «фатаграфічныя» замалёўкі, выкананыя ў канцы 1940-х акварэллю, у 1960-я ён перавёў у тэмперу, дзякуючы чаму яны і захаваліся. Сёння калекцыя Анатоля Наліваева ўтрымлівае нязвыклыя ракурсы і маладомыя дэталі з гістарычнай спадчыны Мінску, аднавіць якія мы ўжо часта не ў стане.

### Брама

Адлюстраваная на малюнку Анатоля Наліваева брама — малавядомы аб'ект. Яе ўдалося лакалізаваць у раёне сённяшняй Кастрычніцкай плошчы, побач з Палацам культуры прафсаюзаў, уздоўж яго бакавога фасаду — за брамай выглядаюць ацалелыя тады вежы каталіцкай Катэдры. Мінскі краязнаўца Віталь Кірычэнка адшукаў здымак 1949 г., які сведчыць, што тады брама яшчэ стаяла. Малюнак Наліваева датаваны 1946 г., і брама на ім зафіксавана ў лепшым стане. Гэта тыповы ўзор «правінцыйнага мадэрну» з алюзіямі на класіцызм. Брама была ўзведзена з чырвонай цэглы на прыватным пляцы, хутчэй за ўсё, на мяжы XIX і XX стст. Гэты, па сутнасці, прыклад «малой архітэктурнай формы» ўзбагачаў вобраз гораду. Падобна, што брама патрапіла ў трасіроўку цэнтральнага праспекту, што не пакінула ёй шанцаў захавацца.

### Палац Чапскага

Зусім іншая сітуацыя складалася з другой пабудовай — палацам злева ад сучаснага будынку Міністэрства унутраных справаў. Анатоль Наліваеў зафіксаваў стан пабудоваў на 1948 г. — над сядзібай МУС (да рэвалюцыі ў гэтым неакласіцыстычным будынку размяшчалася Мінскае земляробчае таварыства ўзаемнага страхавання) яшчэ знаходзіцца скульптура багіні плоднасці і земляробства Дэметры, аднаўленнем якой у 2004 годзе так ганарыцца міністр Навумаў. А сам палац быў у прымальным стане і, відавочна, прыдатны да рэстаўрацыі. Цяпер жа на гэтым месцы знаходзіцца ювелірная крама «Чараўніца» (пр. Незалежнасці, 13). Той даўні будынак заслугоўвае таго, каб быць названым адным з найпрыгажэйшых у горадзе таго часу. Трохпавярховы палац упрыгожаны ніжнім ярусам аркад, а акцэнтам усяго будынку ёсць эркер, які выступае з асноўнага аб'ёму палацу на ўсю яго вышыню.

Спатрэбіліся зрабіць пэўныя росшукі, каб зразумець, што даволі добра захаваны пасля вайны будынак — гэта палац Мінскага гарадскога галавы графа Караля Чапскага. Постаць сама па сабе выбітная — чатыры разы абіраўся галавою Мінскага самакіравання (з 1890 па 1901 — апошняя кадэнцыя няпоўная), з яго імем у Мінску звязаныя ўвядзенне электрычнага асвятлення, будаўніцтва конкі, умацаванне берагоў Свіслачы, узвядзенне новых мастоў, павелічэнне магутнасці водаправоду, значнае паляпшэнне санітарнага стану гораду, ажыўленне фінансавых інстытутаў, адкрыццё гімназій, шпіталёў, публічнай бібліятэкі, забрукоўка вуліц... Фактычна, пад кіраўніцтвам Чапскага Мінск пераўтвараўся ў новаеўрапейскі горад. Абранага першы раз гарадскім галавою ва ўзросце 30 гадоў, Караля Чапскага яшчэ пры жыцці называлі «пераўтваральнікам Мінску». І гэта нягледзячы на складаныя адносіны з кіраўніком царскай адміністрацыі, губернатарам, князем Мікалаем Трубяцкім. Чапскаму ж належаў бровар «Багемія» (сённяшні піўзавод «Аліварыя»).

9 ліпеня 1893 г. граф Караль падаў у Мінскую гарадскую ўправу хадайніцтва аб дазволе на будоўлю трохпавярховага мураванага будынку на Захар'еўскай вуліцы. А ў 1894 г. палац у аснове сваёй быў ужо ўзведзены. Аўтарства праекту новай мінскай адметнасці належала слыннаму пецярбургскаму архітэктару Віктару Шрэтэру, які працаваў у стылістыцы неарэнесансу. Цяпер зразумела, адкуль гэтыя рысы стылю гістарызму ў палацы Чапскага.

Апроч жылых памяшканняў на першым паверсе палацу (якраз там, дзе аркады) размясцілася Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі. Яго ачольвала яшчэ адна легендарная асоба — фундатар касцёлу Св. Сымона і Алены (Чырвонага касцёлу) Эдуард Вайніловіч (якія асобы, які маштаб!), парэшткі якога рупнасцю пробашча а.Уладзіслава Завальнюка ў 2006 г.


Граф Караль Чапскі – пераўтваральнік Мінску.


Палац Чапскага і будынак МУС. Мал. Анатоля Наліваева, 1948 г.


Праект фасаду палацу Чапскага, 1893 г. Аўтар — архітэктар Віктар Шрэтэр.


Палац Чапскага (справа). Здымак 1917 г.


Брама. Мал. Анатоля Наліваева, 1946 г.


Рэшткі старога будынку і брама на месцы будучай Кастрычніцкай плошчы. Архіўны здымак, 1949 г.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Анатоль Наліваеў — мастак і жывая памяць Мінску.**



**Вуліца Гандлёвая. Выгляд з-за Свіслачы. Мал. Анатоля Наліваева, 1948 г.**



**Вуліца Гандлёвая, д.30 (пабудова канца XIX — пачатку XX ст.). здымак першай паловы 1960-х.**



**Вуліца Гандлёвая. Здымак канца 1940-х.**

былі перавезеныя з Польшчы і перапахаваныя ля фундаванага ім касцёлу. У Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі ўваходзілі найбуйнейшыя землеўладальнікі краю, і пад яго кіраўніцтвам ладзіліся навуковыя даследаванні, арганізоўваліся сельскагаспадарчыя выставы і інш., што мусіла спрыяць развіццю аграрнага сектару Беларусі. З 1912 г., ужо пасля заўчаснай смерці графа ў 1904 г., у палацы месцілася агульнатаварная біржа.

Пасля Другой сусветнай вайны, калі праектавалася першая чарга новай забудовы тагачаснай вул. Савецкай, каля 1949 г. палац Чапскага быў знесены, хоць ён зусім не замінаў трасіроўцы новага праспекту — мы бачым, што будынак МУС, што знаходзіўся на адной лініі з палацам, цудоўна захаваўся. Ад вуліцы Валадарскага да Гарадскога валу (Урыцкага) на працягу 1950—1954 гадоў быў узведзены будынак паводле праекту архітэктараў Міхала Асмалоўскага і Генадзя Баданава, у якім, дарэчы, размясціўся кінатэатр «Цэнтральны». Сам па сабе гэты будынак ёсць някепскім узорам савецкай архітэктуры. Але ці варта было дзеля яго руйнаваць будынак-папярэднік? Мінск страціў адзін з самых адметных сваіх будынкаў.

## Вуліца Гандлёвая

Трагедыя вуліцы Няміга ў пачатку 1970-х і ў нашыя дні добра вядомая. Драма ж Гандлёвай зусім забытая. Я таксама меркаваў, што асноўныя разбурэнні адбыліся на ёй падчас вайны. Але архіўныя здымкі, а таксама малюнкі Наліваева сведчаць, што яшчэ ў канцы 1940-х гэтая вуліца, што аблямоўвала ўздоўж Свіслачы старажытны раён Мінску пад назвай Верхні горад, існавала. Больш за тое, выяўленыя Віталём Кірычэнкам у нетрах Беларускага дзяржаўнага архіву навукова-тэхнічнай дакументацыі інвентарызацыйныя здымкі сведчаць, што яшчэ ў 1960-я Гандлёвая была забудаваная капітальнымі будынкамі. Значыць, знішчэнне Гандлёвай адбылося недзе ў той жа час, што і Нямігі, можа, крыху раней.

Сёння гэтую вуліцу спрабуюць адбудаваць у рамках інвестыцыйнага праекту пад лозунгам «Адлюстраванне статусу». Размяшчэнне за фасадамі будынкаў паркінгаў не дазваляе гэтыя працы назваць сапраўднай рэканструкцыяй. Таксама не ясна, наколькі ў праектных працах выкарыстоўваліся архіўныя матэрыялы.

Між тым, вуліца Гандлёвая, што некалі не была самым рэспектабельным месцам, ёсць абсалютна неабходнай для закончанасці ўсяго ансамблю Верхняга гораду, хоць бы з аднаго, узбярэжнага боку. Такія раёны, а не толькі выбітныя помнікі, ствараюць цэльную тканку старажытнага гораду. Нам гэтага так не хапае!

## Пра маштабы ваенных разбурэнняў

Сёння афіцыйна маштабы разбурэння Мінску ў перыяд Другой сусветнай вайны ацэньваюцца недзе ў 80% жылога фонду. Апаненты гэтага погляду называюць 25—30%. Усе гэтыя разбурэнні сталі вынікам нямецкага бамбавання ў чэрвені 1941 г., некалькіх савецкіх бамбаванняў, а таксама «прафілактычных выбухаў», якія праводзіліся нямецкімі ўладамі. Каб забяспечыць праезды і бяспеку, нямецкія сапёрныя аддзелы падрывалі напаўразбураныя і павіслыя канструкцыі. Дадамо тут яшчэ пажары, што ўзнікалі ў выніку бамбаванняў.

Зрэшты, захаваўся яшчэ адзін афіцыйны дакумент, што да статыстыкі разбурэнняў. У тлумачальную запіску 1951—1952 гг. да Генеральнага плану развіцця Мінску 1946 г. былі ўнесеныя наступныя фразы: «Паводле папярэдніх дадзеных інвентарызацыйнага бюро гарвыканкаму на 01.01.1946 г., жылплошча, якая захавалася пасля акупацыі і аднаўленая за перыяд 1944—1945 гг., складала каля 656 тыс. кв. м. Такім чынам, было разбурана 54,2% усяго жыллёвага фонду».

Цяпер пытанне ў тым, што лічыць разбурэннямі. Паводле тэхнічных стандартаў гэта не толькі поўнае, да падмурку, знішчэнне будынку, але таксама істотнае парушэнне яго канструкцый. Сапраўды, большасць дамоў у цэнтры Мінску ў 1944—1945 гг. стаялі без дахаў, з парушанымі перакрыццямі. І ўсе паваенныя здымкі пераканаўча гэта ілюструюць. Прынамсі, пра 25—30% стратаў забудовы гораду гаварыць не выпадае.

Іншая рэч, што падобную, калі не большую ступень разбурэнняў спазналі Варшава, Гамбург, Дрэздэн — і ва ўсіх іх гістарычныя цэнтры былі аднаўленыя! Зрэшты, і ў Мінску многія будынкі, якія на фота тых часоў стаяць без дахаў, сёння спраўна функцыянуюць, як, напрыклад, будынак былой Аляксееўскай жаночай гімназіі (перад вайной — сярэдняй жаночай школы № 9), дзе цяпер месціцца Камітэт па адукацыі і справах моладзі Мінгарвыканкаму (вул. Кірава, 5).

Можна ўпэўнена сцвярджаць, што знішчэнне даўняга Мінску адбылося не толькі праз разбурэнні ў часы Другой сусветнай вайны, а таксама ў выніку мэтаскіраванай дзейнасці па праектаванні і стварэнні новага сацыялістычнага гораду, сталіцы Савецкай Беларусі. «Дасацыялістычны» Мінск застаўся нам на карцінах Анатоля Наліваева.


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Уладзімір Арлоў за прылаўкам**

**У мінскай галерэі «Падземка» (пр.Незалежнасці, 43)** адчынілася «Кнігарня Логвінава». Адзін дзень на тыдзень, у чацвер, кнігу тут можна купіць з рук аўтара. Пісьменнік мусіць трымаць дыстанцыю ад чытачоў — гэта акцыя. І пэўна таму ў «Падземцы» пісьменніка ад спажыўца кніжнай прадукцыі аддзяляе прылавак.

**19 сакавіка з 18.00 да 20.00** за прылаўкам кнігарні будзе стаяць пісьменнік Уладзімір Арлоў. Акрамя кніжак, будзе прэзэнтаваная аўдыёбібліятэка яго твораў. Чытачы! У вас з'явілася цудоўная нагода памучыць улюбёнага пісьменніка: «Спадар Арлоў, пакажыце, калі ласка, вунь той раман з самай верхняй паліцы... Не, не падабаецца... А цяпер вунь той зборнік з далёкага кута...» І хай толькі паспрабуе адмовіць.

**Лявон К.**

## КАНЦЭРТЫ

**Крама**

**27 сакавіка ў к/з «Мінск»** — вялікі сольны канцэрт «Крамы». Спецыяльны госць — Мікалай Аруцюнаў. **Пачатак а 19-й.**

**GARADzKIJA і Бан-Жвірба**

**19 сакавіка ў Гомельскім ГЦК (Ірынская, 16)** — GARADzKIJA і Бан–Жвірба.

**«L.»**

**19 сакавіка ў Вялікай залі Філармоніі а 19-й** пачнецца канцэрт французскай спявачкі «L.». «L.» — маладая французская артыстка, аўтарка, кампазітарка і выканаўца.

**GARADzKIJA ў Мінску**

**20 сакавіка ў «Рэактары» (Харужай, 29)** у межах праекту «Апельсин Alive» — канцэрт рок–гурту GARADzKIJA з прэзентацыяй новага кліпу. Адмысловы госць — гранж–гурт KROK, які выканае старыя песні і часткова новую праграму. **Пачатак а 19-й.**

**Прысвячэнне Queen**

**29 сакавіка а 18-й у DA-club (П.Броўкі, 22)** — канцэрт–прысвячэнне гурту Queen.


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Танцы з «Палацам»

**2 красавіка ў кафэ-клубе «Дэжа Вю» (Валадзько, 6)** выступіць легенда беларускай музыкі — «Палац» з праграмай «Палац» танчыць». Гэтая праграма з'яўляецца вынікам сумеснай працы гурту і DJ RAY Хвісевіча. На канцэрце ўпершыню прагучаць некалькі новых танцавальных апрацовак песень «Палацу». **Пачатак а 20.00.** Квіткі папярэдне 10 тыс. рублёў, у дзень канцэрту — 15 тыс. Квіткі можна набыць у падземных пераходах на ст.м. Якуба Коласа і ля ГУМу. Тэлефон для даведак: (029) 668–94–07.

# Вечарына памяці Валянціна Тараса

**Яна пройдзе 20 сакавіка ў мемарыяльнай зале Дома літаратара (вул.Фрунзе, 5, уваход ад вул.Румянцава). Пачатак а 18.30.**



## ІМПРЭЗЫ



**Гліняны вялес**

**21 сакавіка а 12-й у Полацкім музеі кнігадрукавання** адбудзецца ўганараванне лаўрэата літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес», пісьменніка Барыса Пятровіча.

**Батлейка ў Мінску**

**28 сакавіка,** у гонар Дня тэатру, **у Доме творчасці дзяцей і моладзі (Адзінцова, 10, 2 паверх, актавая зала 237)** Уладзімір Кустаў і пан Скіргайла ладзяць спектакль «Здані з батлейнай скрыні», а пластычны «Тэатр без тлуму і пылу» паказвае спектакль «Сцяна». **Пачатак а 15-й.** Уваход вольны. Даведкі праз т.: (029) 666–31–27 (Уладзімір).

**Творчая сустрэча**

**20 сакавіка** адбудзецца сустрэча з старшынём Таварыства аховы помнікаў Антонам Астаповічам і акторам Юрыем Жыгамонтам **у Германавіцкім культурна-асветным цэнтры імя Язэпа Драздовіча вёскі Германавічы.**

## СПОРТ

**У краіну прыйшла футбольная вясна**

Сезон стартаваў матчамі 1/4 фіналу Кубку Беларусі па футболе. Яны прайшлі ў нядзелю, 15 сакавіка. Салігорскі «Шахцёр» перамог мікашэвіцкі «Граніт» — 2:0, МТЗ–РІПА і «Нёман» — клубы, што яшчэ не прайшлі ліцэнзавання, згулялі ўнічыю — 0:0, БАТЭ перамог «Віцебск» — 1:0. Адзіны мяч у гэтай гульні забіў Віталь Булыга, што два дні таму заключыў кантракт з пяціразовым чэмпіёнам краіны. Скончылася яго ная ўладзівастоцкая адысея. Усе пералічаныя матчы прайшлі ў Мінску. У Магілёве на штучным полі «Гомель» прайграў «Нафтану» — 1:2. Матчы ў адказ пройдуць 21 сакавіка. А 19–ты чэмпіянат Беларусі стартуе 4 красавіка. На старт павінны выйсці 14 камандаў, якія вызначаць не толькі чэмпіёна і двух прызёраў, але — ці не галоўная інтрыга — трох няўдачнікаў (з першай лігі дадасца на наступны год адна каманда). У 2010 г. у вышэйшай лізе павінны гуляць 12 клубаў.

**Беларусь-Германія**

У сераду, 18 сакавіка ў Палацы спорту па адрасе пр–т Пераможцаў, 4 пройдзе адборачная гульня чэмпіянату Еўропы па гандболе 2010 г. між мужчынскімі нацыянальнымі кпмандамі Беларусі і Германії. Пачатак у 19.00. Гандболу ў Мінску не было чатыры гады.

## ВЫСТАВЫ

**«Графема» ў музеі Янкі Купалы**

**Да 5 красавіка ў Літаратурным музеі Янкі Купалы (Янкі Купалы, 4)** працуе выстава «Графема». Гэта выстава мастацтва, у якім знайшлося месца для літар, словаў і словазлучэнняў. Яна ўяўляе з сябе калаж арт–праектаў некалькіх мастакоў, у кожным з якіх у той ці іншай форме, з той ці іншай мэтай прысутнічае тэкст. У выставе бяруць удзел Уладзімір Цэслер, Руслан Вашкевіч, Аляксей Лунёў, Аляксей Губараў, Міхаіл Гулін, Антаніна Слабодчыкава, Сяргей Кірушчанка.

**Мы бачым**

**У кінатэатры «Перамога» (Інтэрнацыянальная, 20) да 1 красавіка** працуе фотавыстава «Мы бачым». Розныя аўтары — розныя стылі, настрої і жанры фатаграфіі. Мы бачым вакол сябе людзей, адчуваем іх настрої, бачым прыроду і горад, мы бачым сённяшні свет...


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Топавая шляхта**

У касах сталіцы не дакупіцца квіткоў на «Пінскую шляхту», што ідзе на сцэне Купалаўскага тэатру. На сакавіцкія спектаклі квіткоў не было за дзесяць дзён, амаль прададзеныя квіткі на красавіцкія паказы. Хутка не будзе і на траўленьскія, кажуць касіркі. Адна з іх патлумачыла прычыну ажыятажу наступным чынам: «Гэта ж топавы спектакль!» **У красавіку «Пінскую шляхту пакажуць» 22-га і 23-га.** Спяшайцеся забраць апошнія квіткі!

**СП**

## ТЭАТРЫ

**19 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта (Інтымны дзённік)»
**Музычны тэатр** — «Прынцэса цырку»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»

**20 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Таполевая завея»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзікае паляванне караля Стаха» (Малая сцэна)
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»
**Музычны тэатр** — «Шклянка вады»
**Цырк-Шапіто** — «Легенды сусветнага цырку»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

**21 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Чычыкаў»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Музычны тэатр** — «Залатое кураня»
**Музычны тэатр** — «Дон Жуан у Севільі»
**Тэатр лялек** — «Жудасны спадар Ау»
**Тэатр юнага гледача** — «Маленькі лорд Фаўнтлерой»
**Цырк-Шапіто** — «Легенды сусветнага цырку»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»

**22 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Музычны тэатр** — «Стойкі алавяны жаўнерык»
**Музычны тэатр** — «Вясёлая ўдава»
**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Цырк-Шапіто** — «Легенды сусветнага цырку»
**Тэатр оперы і балету** — «Рамэа і Джульета»
**Тэатр імя Горкага** — «Нібыта хворы»

**23 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Ах, гэтыя вольныя мятлушкі!»

**24 сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сёстры Псіхеі»
**Тэатр оперы і балету** — «Бахчысарайскі фантан»
**Музычны тэатр** — «Шляпа Напалеона»
**Тэатр юнага гледача** — «Апошняя дуэль»

**25 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Купалаўскі тэатр** — «Варшаўская мелодыя» (Малая сцэна)
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»

**26 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»

**27 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — Тэатральны капуснік
**Музычны тэатр** — «Севастопальскі вальс»
**Цырк-Шапіто** — «Легенды сусветнага цырку»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

**28 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «С.В.»
**Купалаўскі тэатр** — «Апельсінавае віно» (Малая сцэна)
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Цяпер. Сёння... Назаўжды!..»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр лялек** — «Піпі–Доўгаяпанчоха»
**Тэатр юнага гледача** — «Сястра мая Русалачка»
**Цырк-Шапіто** — «Легенды сусветнага цырку»
**Музычны тэатр** — «Магія любові»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

**29 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «КІМ»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвей»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»
**Тэатр лялек** — «Піпі–Доўгаяпанчоха»
**Музычны тэатр** — «Казка пра спячую царэўну»
**Музычны тэатр** — «Баядэра»
**Тэатр оперы і балету** — «Чыпаліна»
**Тэатр оперы і балету** — «Карміна бурана», «Балеро»
**Цырк-Шапіто** — «Легенды сусветнага цырку»
**Тэатр імя Горкага** — «Царэўна-жабка»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»

**31 сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Загадкавая гісторыя Бэнджаміна Батана»

**Загадкавая гісторыя Бэнджаміна Батана.** ЗША, 2008, каляровы, 166 хв.
**Рэжысёр:** Дэйвід Фінчэр.
**Ролі выконваюць:** Брэд Піт, Кейт Бланшэт
**Жанр:** Філасофская меладрама паводле апавядання Фрэнсіса Скота Фіцджэральда

Бенджамін Батан нарадзіўся вельмі нездаровым 80–гадовым старым. І калі ўсе астатнія дзеці сталелі — ён пачаў маладзець... Фільм Дэйвіда Фінчэра, пастаўлены паводле невялічкага апавядання Фрэнсіса Скота Фіцджэральда — удумлівая эпічная меладрама, што нетаропка доўжыцца дзве гадзіны. Брэд Піт і Кейт Бланшэт — з найвялікшай адданасцю граюць закаханых, якія сустрэліся — але разыдуцца, бо яна старэе, а ён маладзее. Пяцігадзінны грым, жэсты й позіркі, сум у вачох, чаканне... У мудрай рэжысуры Фінчэра адчуваецца смак старых класічных раманаў, калі лёс гуляе людзьмі, выпадковасці знітоўваюцца ў чараду незвычайных падзей, але самае важнае застаецца. І ці ж вы думалі, што губляеце толькі, калі старэеце? Галоўны герой стужкі — час. Цёмныя парцьеры старых дамоў і мундзіры Першай сусветнай, забытыя аўтамабілі — і першыя выступы «Бітлоў», зачытаныя да дзірак кнігі — і крохкасць імгнення, што сыходзіць.

Сама стужка — бурштынавая, састарэлая, як дакумент, настоеная, як добрае віно. Яно не кожнаму прыйдзецца даспадобы, але варта яго пакаштаваць.

**Андрэй Расінскі**

# «Белсат»: тэлепраграма на 23—29 сакавіка
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 23 сакавіка, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял, 18 серыя
**19.00** «1945: год, які змяніў свет», дак. фільм, рэж. Гэбі Кент, 2005 г., Вялікая Брытанія, ч. 5
**20.05** Тыдзень з радыё «Свабода»
**20.40** «Еўрасаюз без сакрэтаў», 3 серыя
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.25** Хто ёсць кім?: Ігар Неўпакоеў
*Сёння Маскоўскі тэатр прастадушных шырока вядомы. На постсавецкай прасторы няма нічога падобнага. Нават у Еўропе, дзе ўжо доўгі час ставяцца эксперыменты ў тэатральным мастацтве, прастадушныя Ігара Неўпакоева выклікалі сапраўдны фурор! Шлях рэжысёра і актора Неўпакоева да еўрапейскай славы пачаўся ў Мінску на праспекце Машэрава. Чаму ж Беларусь працягвае раздорваць суседзям свае таленты?*
**21.40** «Таксі–4», маст. фільм, рэж. П'ер Марэль, 2007 г., ЗША
**23.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 4 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 24 сакавіка, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 4 серыя
**18.55** Форум (ток–шоу): Чаму маладыя людзі эмігруюць?
**19.40** «Вароніна возера», дак. фільм, рэж. Інэса Курклієціце, 2007 г., Літва
**20.45** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Першы дзень», дак. фільм, рэж. Марцін Саўтэр, 2008 г., Польшча
**21.45** «Беспрацоўныя панядзелкі», маст. фільм, рэж. Фэрнанда Леон дэ Араноа, 2002 г., Іспанія.
**23.40** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 5 серыя
**00.25** Аб'ектыў (навіны)

### 25 сакавіка, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 5 серыя
**18.55** Рэпарцёр (публіцыстычная праграма)
**19.25** Канцэрт «Салідарныя з Беларуссю» на Замкавым пляцы ў Варшаве
**19.30** «Нетрываласць. Адзін дзень у свеце Далай Ламы», дак. фільм, 2005 г., Італія
**20.30** Праект «Будучыня»: навукова–папулярная праграма тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** YoLife! (моладзевая праграма)
**21.40** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: 5 хвілінаў з глыбіні стагоддзяў — жыццё асобнага чалавека і шлях народу
**21.45** Госць «Белсату»: Павел Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**22.00** «Дзень Волі», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2008, г. Беларусь
**22.30** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**23.00** «Мент», дэтэктыўны серыял, 21 серыя
**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 26 сакавіка, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 21 серыя
**18.55** «Еўрасаюз без сакрэтаў», 3 серыя
**19.15** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**19.35** Падземка (беларускі хіт–парад)
**20.05** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Семя», дак. фільм, рэж. Войцех Каспэрскі, 2005 г., Польшча
**20.35** Кухня (музычная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.30** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**22.00** З архіву Jazz Jamboree, ч. 1: «Рэй Чарлз»
**22.30** Інтэрнаўты выбіраюць
**23.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 22 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 27 сакавіка, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 22 серыя
**18.55** «Без рэтушы»: «Афганец», дак. фільм, 2009 г., Польшча
**19.15** Праект «Будучыня»: навукова–папулярная праграма тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.40** Маю права (прававая праграма)
**19.55** «Без рэтушы»: «Рок назаўжды», дак. фільм, 2008 г., Беларусь, ч. 1
**20.25** Кінастужка (агляд кінарынку)
**20.40** Беларусы ў Польшчы
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату».
**21.30** «Палкоўнік Квяткоўскі», маст. фільм, рэж. Казімеж Куц, 1995 г., Польшча
**23.35** «На поўных абаротах», серыял, 2 серыя
**23.30** «Стараабрадцы, якія адыходзяць», дак. фільм, 2007 г., Беларусь
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 28 сакавіка, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.40** «Цяжкі», дак. фільм, рэж. Мікалай Бандарчук, 2007 г., Украіна
*За апошняе дзесяцігоддзе колькасць дзяцей–сірот ва Украіне павялічылася на 60% і дасягнула 150 тысячаў. Дзіцячыя дамы перапоўненыя. Існаванне прыватных дзіцячых асяродкаў прававая сістэма краіны не рэгулюе. Дзённы сіроцкі дом «Сонечны горад» у Данецку цягам 5 гадоў існаваў па–за законам. Пасля заканчэння школы кожны пяты выхаванец сіроцкага дому пачынае бамжаваць, кожны другі робіцца злачынцам, а кожны сёмы спрабуе скончыць жыццё самагубствам.*
**19.05** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.30** «Дзённік «Народнага альбому», дак. фільм, рэж. Уладзімір Колас, 2007 г., Беларусь
**20.30** Кружэлка (сусветная музыка)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** «Невядомая Беларусь»: «Дзень «Ч». Версія», дак. фільм, рэж. Леанід Міндлін, 2009 г., Беларусь, ч. 1
*Генадзь Карпенка — адна з самых драматычных постацяў беларускага дэмакратычнага руху. Віцэ–старшыня беларускага парламенту, пасля рэферэндуму 1996 г. ён фактычна стаў лідэрам апанентаў улады. У 1999 г. Генадзь Карпенка памёр пры нявысветленых абставінах. Пасля яго трагічнай смерці пачаўся цэлы шэраг знікненняў лідэраў дэмакратычнай апазіцыі. Асноваю для фільму паслужылі архіўныя запісы і аповеды сяброў Генадзя Карпенкі.*
**21.50** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.20** Суботні сеанс: «Цалуй, каго хочаш», камедыя, рэж. Мішэль Блан, 2002 г., Францыя—Брытанія—Італія.
*Сатырычная камедыя маральнасці з калейдаскопам персанажаў — мужчынаў і жанчын, заможных і бедных, маладых і не вельмі, — кожны з якіх па–свойму няшчасны. У фільме безліч камічных сітуацыяў, дамскіх размоваў і эратычных матываў.*
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 29 сакавіка, нядзеля

**18.00** Прэс–экспрэс (агляд друку)
**18.15** «Ранча», серыял, 19 серыя
**19.05** Minsk–Mixt—2008: ч. 4. Канцэрт гурту Svet Boogie Band.
**19.20** «Рэвалюцыя, якой не было», дак. фільм, рэж. Алена Палуніна, 2008 г., Эстонія
*Стужка пра дзейнасць апазіцыі ў сучаснай Расіі. Аўтары фіксуюць крызіс сярод расійскіх апанентаў улады напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2008 г. і задаюць пытанне: якія сёння асноўныя мэты і задачы апазіцыі ды чаму яна не выклікае даверу ў большасці грамадзянаў?*
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Форум (ток–шоу): Школьная рэформа: эксперыменты на дзецях.
*У межах чарговай рэформы адукацыі ўвялі тэставанне, якое часткова замяніла сабою цэнтралізаваныя выпускныя экзамены і цалкам — уступныя. З кожным годам усё менш і менш студэнтаў правільна адказвае на 50% пытанняў. Чаму гэта адбываецца? Ці аказалася рэформа сэнсоўнаю? Чаму вучыць школа цяперашняга беларуса?*
**22.05** «Гісторыя пад знакам Пагоні»
**22.10** Фільматэка майстроў: «Язда», маст. фільм, рэж. Ян Сверак, 1994 г., Чэхія.
*Два маладзёны свабоднай маралі, Франта і Радэк, вырашаюць набыць на вакацыі як мага таннейшую машыну, каб ездзіць па краіне ў пошуках прыгожых дзяўчат. Ім удаецца купіць старую калымагу з французскімі нумарамі, і каб да іх не чапляліся, яны выдаюць сябе за французскіх турыстаў. Аднак замест дзяўчыны першаю ім на дарозе трапляецца бабулька, якую яны падвозяць усяго некалькі метраў. За гэты добры ўчынак лёс дасылае ім падарунак — сустрэчу з загадкаваю рудавалосаю прыгажуняю, якая спрабуе ўцячы ад свайго каханка. Так пачынаюцца іх поўныя гарэзлівасці, кахання і дробнага крыміналу прыгоды... Фільм атрымаў шэраг нацыянальных узнагародаў, у тым ліку і галоўны прыз фестывалю ў Карлавых Варах за 1995 г.*
**22.45** Жаўтуха (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)




# Крызіс на «Белсаце»

## Новыя перадачы тэлеканалу распавядуць, як захаваць грошы ў часы глабальнага спаду эканомікі.

Эканамічны крызіс — самы час паляпаць сябе па кішэнях ды падумаць пра іх змесціва. Калі раней навіны гаспадаркі былі на другіх–трэціх месцах у выпусках навінаў, дык цяпер тэлеканалы амаль штодня адкрываюць эфір паведамленнямі пра эканоміку. «Белсат» таксама не адстае — дзве праграмы, якія нядаўна стартавалі на тэлеканале, прысвечаныя пытанням гаспадаркі. «Рэальная гаспадарка» і «Асабісты капітал» будуць выходзіць па чарзе штоаўторак.

Адрозненні паміж канцэпцыямі гэтых дзвюх перадачаў заўважныя не адразу. Але, прыгледзеўшыся, разумееш, што стваральнікі «Рэальнай гаспадаркі» спрабуюць разабрацца ў разнастайных эканамічных з'явах, а «Асабісты капітал» (адсюль і назва) скіраваны менавіта на тое, каб дапамагчы людзям канкрэтнымі парадамі: як зэканоміць, падзарабіць ці абараніць свае грошы.

### «Рэальная гаспадарка»

У першым выпуску перадачы распавядалася пра сітуацыю з попытам на аўтамабілі, праблемы малога бізнэсу, а таксама пра тое, як распачаць сваю справу, адчыніўшы школу ўсходніх танцаў.

Машыны таннеюць, але не робяцца больш даступнымі, бо людзям не даюць крэдытаў так лёгка, як раней. Журналіст «Рэальнай гаспадаркі» гутараць з пакупнікамі ды прадаўцамі на аўтарынку, супрацоўнікамі аўтамабільнай фірмы і нават са спявачкай Алесяй.

Як высвятляецца, яна набыла новы «БМВ» на піку цэнаў — цяпер магла б прыдбаць такі самы легкавік на 10 тысячаў даляраў танней. Але Алеся не сумуе: «Я лічу, што няма сэнсу азірацца назад». Згубленых грошай спявачка шкадуе не болей, чым набойку з абцасіку. А вось Вячаслаў, які набыў сабе новую «Таёту» ў крэдыт, хвалюецца, што не зможа выплаціць пазыку. Сапраўды, кожны перажывае крызіс па–рознаму.

У рубрыцы «Сакрэт фірмы» распавядаюць гісторыю жанчыны, якая вырашыла адчыніць уласную школу ўсходняга танцу. Пачала яна з таго, што набрала маленькую групу, а цяпер у яе школе выкладае каля 14 выкладчыкаў. 450 даляраў на вучобу, яшчэ 400 на касцюмы, ды арэнда памяшкання за 400 даляраў на месяц — вось мінімум інвестыцыяў, якія патрэбныя для таго, каб адкрыць такі бізнэс.

### «Асабісты капітал»

Перадача адразу ўражвае якаснай камп'ютарнай графікай ды песняй у застаўцы: у гітарных рытмах і вакале лёгка пазнаеш Ігара Варашкевіча з «Крамы»:

«У банкаўскіх паперах як разабрацца вам,
Як зэканоміць грошы і жыць без пераплат,
Куды і што ўкласці, каб крызіс не з'ядаў,
Раскажам у праграме «Асабісты капітал».

Такое вось няхітрае крэда. Зрэшты, і праблемы, якімі займаюцца журналісты праграмы, таксама досыць прыземленыя: як зэканоміць на ацяпленні? У якой валюце трымаць грошы? Як застрахавацца ад непрыемнасцяў з выплатай крэдыту?

«Калі маразы мацнеюць, грошы ў кішэнях растаюць. Зіма — час вялікіх рахункаў за камунальныя паслугі», — кажа журналістка, выпраўляючыся ў камандзіроўку ў правінцыйнае мястэчка. Як ягоныя жыхары даюць рады ацяпленню сваіх дамоў тады, калі мясцовая кацельня працуе неэфектыўна? Як усталяваць аўтаномнае ацяпленне і ці мае гэта практычны сэнс? Адказы шукаюць галоўны інжынер «Мінскіх цепласетак», юрыст і самі карыстальнікі цяпла.

Калі вы хочаце пагуляцца ў інвестара, глядзіце рубрыку перадачы «Шалёныя грошы». Адмыслова запрошаны дасведчаны эканаміст эксперыментуе, два разы на месяц «інвестуючы» віртуальныя 100 мільёнаў рублёў самым розным чынам. Што лепей — трымаць грошы на рахунку ў банку, у каштоўных паперах, ці набыць валюту? А можа — золата? А калі ўсё разам, то ў якой прапорцыі? Дарэчы, гледачы таксама могуць пакідаць свае прапановы як лепей інвеставаць тыя ўяўныя грошы, на форуме перадачы belsat.eu/forum ці дасылаць іх па электроннай пошце a_kapital@safe–mail.net. А праз два тыдні вядоўца прапануе паглядзець, колькі атрымалася зарабіць ці колькі згубілася на гэтай інвестыцыі.

У рубрыцы «Барані сваё» распавядаецца пра кашмарную гісторыю інструктаркі па воднай аэробіцы, якая выступіла паручальніцай для свайго знаёмага бізнэсоўца і мусіла вяртаць крэдыт пасля таго, як ён збег у Маскву. Каб сабраць тыя 8 тысячаў даляраў, яна мусіла больш за паўтара году аддаваць на гэта ўвесь свой заробак. Нават суд не дапамог.

Заўважна, што гаспадарчыя перадачы «Белсату» арыентаваныя найперш на беларускі сярэдні клас, які, нягледзячы на крызісы і выбрыкі адміністрацыйнай эканомікі, прымерваецца да адкрыцця ўласных невялічкіх справаў, вагаецца паміж набыццём новага і патрыманага легкавіка, думае, як найлепей захаваць свае пяць–дзесяць тысячаў даляраў, ашчаджаных за гады нялёгкай працы. Сваіх гледачоў новыя праграмы абавязкова знойдуць. Чым меней маеш грошай, тым часцей пра іх думаеш, і тэлеперадачы з парадамі ды ідэямі тут вельмі дарэчы.

**Алесь Кудрыцкі**



# Ад неба — зямлі

Хлопчык-медыум, які запісвае на зямлю «нябесныя бегі». Такую скульптуру, прысвечаную Язэпу Драздовічу, стварыў мастак Гэнік Лойка. Ідэальным ландшафтам для яе могуць стаць пагоркі і неба Драздовічавай Глыбоччыны.

# Тэктанічнымі намаганнямі

АЭС будуюць не для беларускіх патрэбаў, а для экспарту энэргіі, піша эксперт.

Зямля дрыжала, быў чуваць страшны гром, звінелі шыбы, стваралася ўражанне, што падае дом, жывёлы падалі на калені, недалёка ўтварыўся глыбокі роў з вярсту ўдоўжкі... Так апісалі гэта журналістам жыхары хутару Сяржанты пад Гудагаем. Журналістам «Нашай Нівы», дарэчы.

Небаракаў страсянула а 2-й гадзіне ночы 28 снежня 1908 году. Самы адчувальны на тэрыторыі нашай Беларусі землятрус у 7 балаў!

Яшчэ 9 кастрычніка 2008 году загадчык лабараторы Аб'яднанага інстытуту энэргетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны» Ваган Казанян панікуе: «Астравецкая пляцоўка знаходзіцца ў абсягу магчымага землятрусу. Зямля там растрэсканая, як сподак. А на разломах АЭС будаваць нельга. Таму цяпер геолагі і сейсматэхнікі сярод разломаў вышукваюць месца, на якое можна паставіць станцыю».

Цяпер скажыце, на якое ліха вышукваць месца для АЭС сярод разломаў? Бо яно найзручнейшае, каб прадаваць нашу атамную электрычнасць у Літву!

Нам самім гэтая атамная электрычнасць не надта патрэбная — Беларусі хапае сваіх магутнасцяў. А тут — да Вільні 53 км. Да мяжы — 20 км. Да Ігналіны — бліжэй, чым да Мінску. І там пад гэтую нашую АЭС не трэба мяняць электрасеткі, напісаў у сваім блогу журналіст Віктар Мальшэўскі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**У гэтай АЭС можа быць і наша жыццё, і наша смерць. На фота злева: міністр энэргетыкі Аляксандр Азярэц.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Віншуем Вольгу і Змітра Салошкіных,** а таксама маладых салашчанятаў з нараджэннем дачушкі і сястрыцы Дамінікі. Калегі

**Здароўя і шчасця Дамініцы Салошкінай!** Кастусь Смолікаў

### МАЛЕБЕН

**Запрашаем** на малебен за Беларусь і беларуск і народ! Шаноўныя браты і сёстры, у Віцебску адноўленыя службы на беларускай мове ў Праваслаўнай Царкве! Кожны чацвер у 19.30. Вул. Камуністычная, 15 (праваслаўная Свята-Успенская царква). Т.: 8-029-711-83-14. maleben 2009@yahoo.com

### НАБУДУ

**Куплю** за сімвалічны кошт дзічкі (непрышчэпленыя сеянцы) цытрусавых. Вялізныя экзэмпляры абмяняю на культурныя чаранкі. Сяргей (г. Мінск). Т.: 126-90-18, graj@mail.ru

### КВАТЭРА

**Здам** кватэру з мэбляй на працяглы тэрмін. Танна! Для беларускамоўных яшчэ танней! Т.: (029) 757-94-07

### ПРАЦА

**Выкладчык** ВНУ дапаможа падрыхтавацца да напісання цэнтралізаваных тэстаў па англійскай мове. Т.: (029) 550-75-05 (Мінск)

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжы «Замкі Беларусі» 22 сакавіка (нядзеля)** па маршруце: Мінск—Мір—Навагрудак—Любча—Шчорсы—Ліда—Іўе—Мінск. 29 сакавіка (нядзеля): Беніца—Крэва—Баруны—Гальшаны—Вішнева—Дзесятнікі—Валожын. Т.: (029) 622-57-20; (029) 509-12-16; (029) 110-19-28; 292-54-58

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ЖАРТ

Беларускі футбольны клуб вяртаецца з замежнага збору.
Журналіст па прылёце бярэ інтэрв'ю ў капітана каманды:
— Ну як збор прайшоў?
— Выдатна, усе дні дождж ліў.
— А чаго ж выдатнага?
— Дык бар жа працаваў і ў дождж.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Хто жыве на гэтым свеце
Толькі розумам чужым, —
Век на povadze праходзіць,
Не пацешыцца ні ў чым.

Не ўсё можна людзям верыць,
Праўдай толькі трэба жыць;
Мусіш дзесяць раз адмерыць,
Покі што пачнеш рабіць.

**Юстына, Жарабілаўка**
**«Наша Ніва». №. 1909**

## Марыя Вайцяшонак. Серпень



Новая кніга ў серыі «Кнігарня Наша Ніва».

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5520. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 17.03.2009.
Замова № 1447.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
ISSN 1819-1614
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12